Сёньня пачынаецца дэкада ўраджаю і калектывізацыі

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КАСТРЫЧНІК 28 1932 г. № 241 (4493)

Год выдаўня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — За высокі кошт калгаснага працадня (1 стар.).

А. В. ЗЯНЮК — Глеўкавая хвароба на асушаных тарфяніках (2 стар.).

М. МОДЗЭЛЬ — На ўздыме (3 стар.).

Прамовы старшыні ЦВК СССР т. І. М. Калініна на мітынгу адкрыцця Дняпроўскай гідра-электрастанцыі і на харкаўскім трактарным заводзе пры ўзнагародзе ордэнам Леніна рабочых (2 стар.).

Аб правядзеньні дэкады ўраджаю і калектывізацыі—пастанова ЦК КП(б)Б (1 ст.).

Шырока скарыстаць вопыт саўгасаў і калгасаў у барацьбе за высокі ўраджай, за стварэньне моцнай кармовай базы (1 стар.).

Маршруты бульбы прасоўваць у пралетарскія цэнтры з максымальнай хуткасьцю (1 стар.).

Поўнасьцю ажыцьцявім пастанову ЦВК СССР аб вышэйшай школе (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ: Непакой у палаце абшчын (1 стар.).

Дэфэнзыва і «язда на цягніках» (4 ст.).

ЗА ВЫСОКІ КОШТ КАЛГАСНАГА ПРАЦАДНЯ

Калгасы БССР шчыльна падыходзяць да важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі, — разьмеркаваньня даходаў па працаднёх. У часе разьмеркаваньня будуць падагулены вынікі 1932 гаспадарчага году. На канкрэтных паказальніках калгасьнікі пераканяюцць перавагі калектыўнай працы, ускрыюць пасабныя памылкі, якія былі дапушчаны брыгадамі, праўленьнямі, намецяць дальнейшыя мерапрыемствы па павышэньні ўраджайнасьці.

Кожны камуніст перш-на-перш павінен усьвядоміць усю гаспадарчую і палітычную сутнасьць падыходзячай кампаніі. **Правільнае разьмеркаваньне даходаў выключна па колькасьці і якасьці затрачанай працы зьяўляецца зараз асноўным зьвяном у рабоце партыйных ячэек на вёсцы.** Толькі тады, калі партыйныя арганізацыі па месцах ухопяцца за гэтае асноўнае зьвяно, можна будзе з поспехам выцягнуць увесь ланцуг астатніх арганізацыйных мерапрыемстваў, зьвязаных з вырашэньнем цэнтральнай задачы сельскай гаспадаркі — павышэньнем ураджайнасьці. Хто гэтага не разуме, той **па-сутнасьці** нічога не разумее ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва.

Наколькі высокая або нізкая даходнасьць прынадае на працадзень, наколькі зьніжаецца ўраўнілаўка, наколькі заслужана ацэнваецца затрачаная праца — вось што цікавіць кожнага калгасьніка і калгасьніцу. Сучасны працадзень — гэта барометр арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу, барометр усяго як гаспадарчага, так і палітычнага жыцьця арцельнай гаспадаркі. **Поўнацэнны працадзень — самы лепшы стымул для ўмацаваньня калгасаў на данай арцельнай стадыі іх разьвіцьця.**

Кошт-жа працадня залежыць у першую чаргу ад умелай арганізацыі гаспадаркі, эфэктыўнага скарыстаньня сродкаў вытвор часьці, правільнай расстаноўкі рабочай сілы. Іменна там, дзе скарыстаны ўсе магчымасьці, усе перавагі калектыўнай працы для атрыманьня больш высокага ўраджаю пасьпяховага правядзеньня сяўбы і ўборкі, там вынэй будзе ацэньвацца і працадзень. У тых-жа калгасах, дзе ігнараваліся элементарныя агра-тэхнічныя правілы, дзе дрэнна была арганізавана праца, дзе дапушчаны вялікія страты пры ўборцы, там атрымалі асушаны ўраджай, там будзе прыпадаць і меншая даходнасьць на працадзень.

У выніку мы бачым, што тут адно другое абумоўлівае. З аднаго боку, — высокі кошт працадня зьяўляецца самым магутным вагаром для далейшага непераможнага руху наперад па шляху арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, з другога боку — для атрыманьня высокай даходнасьці на працадзень неабходна выкарыстаць усе магчымасьці, якія створаны пралетарскай дзяржавай у перыяд рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

У выпадках разьмеркаваньня, як у люстэрку, будуць адлюстраваны ўсе дасягненьні і недахопы кожнай гаспадаркі. Ад таго, якія даходы атрыманы ў гэтым годзе, наколькі правільна яны будуць разьмеркаваны, залежаць поспехі падрыхтоўкі да першай вясны другой пяцігодкі.

У выніку тэй работы, якая праведзена на вёсцы ўвесну гэтага году, калгасьнік у больш шырокіх разьмерах стаў адчуваць сябе **сапраўдным гаспадаром** калгаснай маёмасьці. Ён пачаў бераклівa адносіцца да сродкаў вытворчасьці, актыўна змагаецца са злодзеямі і хуліганамі, якія псуюць і раскрадваюць калгаснае дабро. Разьмеркаваньне даходаў па прынцыпу — хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае, — яшчэ больш умацуе сацыялістычную сьвядомасьць калгасьніка, будзе спрыяць правільнаму спалучэньню ўласных інтэресаў з інтэресамі ўсяго калгасу ў цэлым.

Зараз увага ўсёй КП(б)Б скацэнтравана на хутчэйшым скончэньні асеньніх гаспадарча-палітычных кампаній: збожжа-загатоўкі, адгрузка бульбы Ленінграду, зяблева.

Хуткае і правільнае разьмеркаваньне непарыўна зьвязана з пасьпяховым выкананьнем плянаў збожжазагатовак. **Выканаць свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай, стварыць насенныя фонды для вясны 1933 году — першачарговая задача кожнага калгасу.** Чым хутчэй будзе выкананы плян збожжа, створаны насенныя фонды — тым лепш для калгасьнікаў.

Многія забываюць пастанову СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 5 лістопада, у якой сказана: **«пасьля скончэньня здачы прадукцыі паводле ўстаноўленага пляну дзяржаўных загатовак раньніх збожжавых культур і пасьля вызначэньня насенных фондаў бяз ускага затрыманьня калгасьнікам павінна быць выдана праўленьнем калгасу ўся астатняя частка харчовага і кармовага збожжа, якое ім прылічваецца».**

Трэба работу па разьмеркаваньні пастаўіць так, каб як толькі калгас выканае плян загатовак і стварыць насенныя фонды, астатняя натуральная частка, якая належыць па працадзёх, **неадкладна** разьмяркоўвалася сярод калгасьнікаў. Вакольныя калгасы па прыкладзе перадавых будуць старацца хутчэй здаць збожжа па загатоўках, стварыць насенныя фонды з тым, каб не зацягваць у сябе разьмеркаваньне.

У тэй-жа пастанове ЦК і СНК выразна падкрэслена, што трэба стварыць такія ўмовы, каб **«калгасы лепш пасеяўшыя, убраўшыя і акуратна выканаўшыя ўстаноўлены для іх плян дзяржаўных загатовак, мелі адпаведна ў сваім распараджэньні для ўласных патрэб большую колькасьць збожжа».**

Гэта абавязвае партарганізацыі павесьці самую рашучую барацьбу з разбуханьнем адміністрацыйных выдаткаў у калгасах, з разбазариваньнем працадзён, стварэньнем непатрэбных харчовых фондаў і г. д. Трэба кожны працадзень узяць на ўлік. Не дапускаць ні аднаго шмяцка выдатку як грошай, так і натуральнай часткі. Толькі пры такіх умовах можна значна павысіць кошт працадня.

Пляны разьмеркаваньня павінны дэтальна абгаварвацца з масамі: на агульных сходах, брыгадах, на сходах жанчын калгасьніц і г. д.

Правільнае разьмеркаваньне можа быць забясьпечана толькі пры **канкрэтным** кіраўніцтве, пры штодзённай дапамозе з боку раённых арганізацый кожнаму калгасу паасобку. Трэба мабілізаваць рахункові апарат, паслаць яго ў калгасы на дапамогу па наладжваньні справаздачнасьці, прымацаваць да групы калгасаў адказнага раённага работніка, які будзе несьці перад райкомам адказнасьць за разьмеркаваньне даходаў тга або іншага калгасу.

ЦК КП(б)Б у сёнешняй пастанове **«аб правядзеньні дэкады ўраджаю і калектывізацыі»** абавязвае ГК і РК КП(б)Б правесьці справаздачу калгасаў перад аднасобнікамі аб пашырэньні выніках гаспадарчага году, аб разьмеркаваньні даходаў па працаднёх, аб выкананьні абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай.

На сходах трэба паказаць усе перавагі калектыўнай працы, паказаць лепшыя брыгады, якія дасягнулі высокага ўраджаю, паказаць кошт іх працадня ў параўнаньні з працаднём тэй брыгады, якая слабо змагалася за якасьць работы, за ўкарашэньне агратэхнікі.

Дэкада ўраджаю і калектывізацыі павінна паклясьці пачатак шырокай мабілізацыі мас калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і МТС на барацьбу за вырашэньне цэнтральнай задачы сельскай гаспадаркі — атрыманьне высокага ўраджаю па ўсіх без выключэньня культурах.

НЕПАКОЙ У ПАЛАЦЕ АБШЧЫН

ЛЕНДАН, 26. Учора ўрад папаў у парляманце пад новую бамбардыроўку запытаньняў аб англа-савецкіх гандлёвых адносінах. На гэты раз запытаньні выходзілі ня з боку лібэралаў але лейбарыстаў, а з боку радыкальных кансэрватараў.

Кансэрватар Чарльтон запытаў: «Якія крокі робіць урад у мэтах скарачэньня беспрацоўя шляхам пашырэньня магчымасьцяй атрымаць савецкія заказы?»

Кольвіль заявіў ад імя ўраду, што апошні ня мае намеру ўносіць зьмен у сваю папярэднюю палітыку ў галіне англа-савецкага гандлю: максымальны тэрмін для прадастаўленьня крэдытаў—18 месяцаў.

Кансэрватар Гомэрсьлі запытаў: «Ці можна лічыць, што ніякія перагаворы, якія зараз вядуцца, не пацерпяць ад рашэньня ўраду скасаваць існуючую згоду з СССР?»

З прычыны таго, што адноўны адказ Кольвіля яго, відавочна, не супакоіў, ён зноў задаў пытаньне: «Ці можна лічыць, што брытанскія прамысловцы не пацерпяць ад нашага рашэньня скасаваць згоду?»

На гэта Кольвіль са здзіўляючай упэўненасьцю адказаў: «Так, зразумела», бяручы як-бы на сябе адпаведнае абавязацельства ад імя савецкіх арганізацый. Між тым ні адна з тутэйшых савецкіх арганізацый не ўпаўнаважыла Кольвіля даваць запэўненьні ў тым, што ангельскія інтэрэсы не пацерпяць у рэзультаце спыненьня гандлёвай згоды.

Лейбарыст Кірквуд заявіў, што суднабудаўнічая і машынабудаўнічая прамысловасьць мае магчымасьць атрымаць савецкія заказы, якія могуць даць работу 25 тыс. беспрацоўных у выпадку пашырэньня ўрадавых крэдытаў і прагнаваў у сувязі з гэтым парляманту абмеркаваць пытаньне аб пашырэньні крэдытаў.

Гэта прапанова была адхілена старшынёю.

ФУНТ ПАДАЕ

ПАРЫЖ, 26. Фунт стэрлінгаў працягвае падаць на парыскай біржы. На мінулым тыдні ён катыраваўся па курсу 86,38, а зараз ён зьнізіўся да 84,50 франкаў.

* *

ЛЕНДАН, 26. Учора фунт стэрлінгаў зноў рэзка зьнізіўся да 3 даляраў 32 з пал. цэнтаў, г. зн. да самага нізкага ўзроўню спачатку сьнежня мінулага году. На біржы палі ангельскія каштоўныя паперы. Золата падалося ў цане на 1 шылінг на ўнцыю і дасягнула найвышэйшага ўзроўню за ўвесь год.

Рад газет, у тым ліку «Дэйлі геральд», прабуе вытлумачыць зьніжэньне курсу пра шукамі кантынэнтальных спэкулянтаў.

Аднак, «Дэйлі тэлеграф» справядліва ўказвае, што сапраўдная прычына зьніжэньня курсу фунта заключаецца ў росьце на кантынэнце «ўражаньня, якое выклікаецца цяперашнім станам беспрацоўя ў Англіі».

ШЫРОКА СКАРЫСТАЦЬ ВОПЫТ ПЕРАДАВЫХ САЎГАСАЎ І КАЛГАСАЎ у барацьбе за высокі ўраджай, за стварэньне моцнай кармовай базы

Аб правядзеньні дэкады ўраджаю і калектывізацыі

Пастанова ЦК КП(б)Б

Надаючы вялікае гаспадарча-палітычнае значэньне дэкадзе ўраджаю і калектывізацыі, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Дэкаду ўраджаю і калектывізацыі правесьці з 28 кастрычніка па 8 лістапада пад знакам папуляризацыі посьпехаў сацыялістычнай індустрыялізацыі СССР і БССР і год вядзеньня вынікаў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, мабілізацыі партыйна-савецкіх арганізацый і шырокіх мас рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў вакол задачы павышэньня ўраджайнасьці, як галоўнай і цэнтральнай задачы сельскай гаспадаркі на даным этапе, вакол арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Адначасова дэкада павінна быць выкарыстана для павышэньня тэмпаў правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній (загатоўкі, зяблева, скончэньне азімай сяўбы і інш.).

2. ЦК звяртае асаблівую ўвагу раённых партыйных арганізацый на мабілізацыю шырокіх мас рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў вакол папуляризацыі і выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб павышэньні ўраджайнасьці, з улікам усіх дзелавых прапаноў калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і МТС аб павышэньні ўраджайнасьці. Дэкада ўраджаю і калектывізацыі павінна зьвяцца пачаткам шырокага фэзгрэнтай зімовай агратэхнічнай прапаганды, па ходам за аўладаньне агразоатэхнікай шырокімі масамі рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў (арганізацыя агратэхнічных гурткоў, курсаў, агразоатэхнічных габінэтаў, гутарак, лекцый і г. д.).

3. ЦК завастрае ўвагу ўсіх камуністаў і камсамольцаў, працуючых у вёсцы і раённых арганізацыях, на неабходнасьць аўладаньня з іх боку ў найкарацейшы тэрмін тэхнікай буйнай сацыялістычнай сельска-гаспадарчай вытворчасьці і агразоатэхнікай, без чаго немагчыма глыбокае і канкрэтнае кіраўніцтва саўгасамі, МТС і калгасамі. Кожны камуніст і камсамолец вёскі павінен добра ведаць канкрэтныя шляхі барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці культур свайго раёну (лён, бульба, збожжавыя культуры і інш.).

Абавязаць Наркамзем, Трактарацэнтр, Калгасцэнтр, усе РК КП(б)Б і РК ЛКСМБ арганізаваць пасьля скончэньня ўборкі ў кожным раёне шырокую сетку курсаў, школ і гурткоў для актыву партыйных, савецкіх і зямельна-калгасных органаў.

4. ЦК лічыць, што зімовы перыяд павінен быць выкарыстаны цэлы інтэнсыўнай вучобы актыву камуністаў, камсамольцаў па аўладаньні тэхнікай буйнай сацыялістычнай сельска-гаспадарчай вытворчасьці і агразоатэхнікай з тым, каб папярэдняй веснавой сяўбы 1933 году ўся КП(б)Б і ЛКСМБ вышлі ўзброенымі канкрэтнымі ведамі барацьбы за сапраўднае павышэньне ўраджайнасьці.

5. ЦК прапануе ўсім партыйным, савецкім, зямельна-калгасным органам правядзеньнем дэкады ўраджаю і калектывізацыі пакласьці пачатак разгортваньню магутнага руху мас на барацьбе за выпрацоўку і сапраўднае ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці (сацыялістычны ўмовы на лепшае аўладаньне агра-зоатэхнікай камуністамі і камсамольцамі, беспартыйным актывам, на лепшую падрыхтоўку да пасеўнай кампаніі інвэнтару, захаваньне ў патрэбнай колькасьці і якасьці гатунковага насеннага матар'ялу, на ўсваеньне і ажыцьцяўленьне калгасамі і саўгасамі і МТС у часе сяўбы патрэбных агра-тэхнічных умоў і інш.).

Даручыць агітмасадзелу ЦК разам з Наркамземам у дэкадны тэрмін распрацаваць праграму па аўладаньні агразоатэхнікай актывам, пытаньні ахопу вучобай калгаснага актыву, снабжэньня літаратурай і інш. і свае прапановы перадаць на разгляд сакратарыяту ЦК.

Даручыць Наркамзему, навукова-дасьледчаму саўгаснаму і калгаснаму інстытутам, ДВБ і агітмасаваму аддзелу ЦК у месячны тэрмін распрацаваць і выдаць папулярныя лістоўкі, брашуры і лёзунгі з вычарпальным указаньнем канкрэтных мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці, рашаючых культур рэспублікі (лён, канопелі, бульба, збожжа).

6. Абавязаць ГК і РК КП(б)Б правесьці справаздачы калгасаў перад аднасобнікамі аб выніках арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, папярэдніх вынікаў сельска-гаспадарчага году: разьмеркаваньня ўраджаю і выкананьня абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай, паказваючы перавагу калектыўных гаспадарак перад аднаасобнымі.

Шляхам арганізацыі міжкалгасных і раённых выставак, забясьпечыць паказ посьпехаў саўгасаў, МТС і калгасаў у павышэньні ўраджайнасьці, прадукцыйнасьці жывёлагадоўлі і мэханізацыі сельскай гаспадаркі. Шырока прэміяваць саўгасы, МТС, калгасы, брыгады, брыгадзіраў-ударнікаў і ўдарнікаў, якія пакажуць сапраўдную барацьбу за павышэньне ўраджайнасьці, прадукцыйнай жывёлагадоўлі, арганізацыі павышэньня прадукцыйнасьці працы. Абавязаць Наркамзем, Калгасцэнтр і Трактарацэнтр, усе зямлеробчыя і жывёлагадоўчыя трэсты вылучыць для гэтай мэты спэцыяльны прэміяльны фонд.

8. Для кіраўніцтва падрыхтоўчай і правядзеньнем дэкады ўраджаю і калектывізацыі стварыць пры Наркамземе цэнтральную камісію ў складзе таварышоў: Рачыцкага (старшыня), Драйчука (агітмасадзел ЦК), Стрэле (Калгасцэнтр), Тамашэўскага (Трактарацэнтр), Кавалёва (ЦСПСБ), Ляхава (ПК ЛКСМБ), Войтава (редакцыя «Зьвязды»), Цыкіна («Савецкая Беларусь») і Лебедзева («Калгасьнік Беларусі»). Даручыць камісіі ў трохдзённы тэрмін распрацаваць план правядзеньня дэкады ўраджаю і калектывізацыі і па ўгадненьні з агітмасавым аддзелам ЦК дасласць раёнам.

З 29 дакладчыкаў на раён выехаў... 1

МАГІЛЕЎ. (Наш спэцкор). Магілеўскі раён у гэтым годзе павінен зазяблiць 39.812 га. Згодна дырэктыў ЦК і СНК да 20 кастрычніка трэба было плян выканаць на 100 проц. Між тым, зазяблена 52,8 проц. пляну. Большасьць калгасаў і сельсаветаў 75 проц. цягавай сілы на зяблева не пераключылі.

У радзе калгасаў ёсьць яўнае ігнараваньне зяблева. Калгас «Ударнік», Вендараўскага сельсавету, які, ня гледзячы на тое, што ў асноўным закончыў правядзеньне ўсіх сельска-гаспадарчых работ, да гэтага часу, нават не прыступіў да зяблева.

Калгасы імя Ланцуцкага і Калініна, Дасовіцкага сельсавету, зусім не распачалі зяблева. Коняй яны скарыстоўваюць на іншых работах, а тлумачаць невыкананьне пляну зяблева адсутнасьцю конскай цягавай сілы. Калгас «Новы сьвет», Княжыцкага сельсавету, фактычна таксама не пачаў ворыва. З патрэбных 150 га, узараў толькі 8 га.

Большасьць калгасаў раёну, асабліва тыя, якія абслугоўваюцца МТС, яўна не жадаюць пераключыць конскую цягавую сілу на зяблева. Яны чакаюць, што плян выканае МТС.

Бальшавіцкі прыклад у выкананьні пляну зяблева паказалі калгасы Хрыпялеўскага сельсавету, якія дабіліся 98 проц., Брапаўскага—81,2 проц., Махаўскага—84,3 проц. і Палыкавіцкага—89 проц. Гэтыя сельсаветы дабіліся посьпехаў дзякуючы пераключэньню на зяблева 75 проц. цягавай сілы і правільнай арганізацыі працы.

Зусім дрэнна ідзе зяблева ў саўгасах і прыгарадных фермах раёну, у якіх выкананьне пляну складае толькі 12 проц. 16 саўгасаў да гэтага часу нават яшчэ не прыступілі да ворыва. Саўгас «Гарадок», які мае выстарчальную колькасьць рабочых рук і цягавай сілы, выканаў плян на 25 проц., саўгасам «Вейна», Трабянеўскага сельсавету, зазяблена 16 проц. пляну.

Лепш стаіць справа з выкананьнем пляну зяблева ў саўгасе імя Розынгольца. Рабочы калектыў гэтага саўгасу абмеркаваў на агульным сходзе пастанову ЦК і Саўнаркому аб павышэньні ўраджайнасьці, адзначыў слабую барацьбу саўгасу за выкананьне гэтай пастановы. Калектыў узяў на сябе абавязак поўнасьцю ажыцьцявіць пастанову ЦК і СНК.

У выніку ўдарнай работы выкананьне пляну зяблева складае 80 проц.

За ўвесь час як РВК, так і РК КП(б)Б не заняліся пытаньнем ходу зяблева па раёну. Яны нічога канкрэтнага да рэалізацыі пастановы ЦК і СНК аб павышэньні ўраджайнасьці ня прынялі.

Уся безадказнасьць некаторых раённых работнікаў да выкананьня важнейшых пастаноў ЦК і СНК характарызуецца наступным фактам. Райком КП(б)Б намецiў 29 верасьня правесьці палітдзень, на якім павінна была быць прапрацавана пастанова аб павышэньні ўраджайнасьці. 21 кастрычніка бюро РК КП(б)Б канстатавала... з 29 дакладчыкаў на раён выехаў толькі 1. У выніку палітдзень сарваўся, пастанова ў партыйных ячэйках не прапрацавана.

У дэкаду ўраджаю і калектывізацыі Магілеўскі РК КП(б)Б павінен мабілізаваць усе сілы і сродкі на ліквідацыю прарыву па зяблеву, на практычнае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК і СНК аб павышэньні ўраджайнасьці.

Аршаншчына--перадавы раён па сіласаваньні

Сакратару ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО, старшыні СНК БССР тав. Галадзеду

У выніку тэрміновай барацьбы перадавых калгасаў за стварэньне моцнай кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі, пры шырокім разгортваньні сацыябарніцтва і ўдарніцтва—да 15-й гадавіны Кастрычніка наш раён першым у БССР выканаў плян сіласаваньня на 110 проц.

Засіласавана **20.614 тон.** Сіласаваньне працягваем. Скарыстоўваем капусны лісьт, батву бураковую, бручкі і інш. Кожная дойная карова МТКФ забясьпечана больш чым на 3 з пал. тоны і кожная карова калгасьніка на 2 тоны сіласу.

Паведамляючы аб нашых перамогах пасім уключыць наш раён да 15-й гадавіны Кастрычніка ў лік перадавых раёнаў па правядзеньні сэцэльнага сіласаваньня. З свайго боку абавязваемся на будучы год павялічыць плошчу сяўбы сілясных культур і яшчэ лепш удасканаліць тэхніку сіласаваньня.

Сакратар райкому Гасман.
Старшыня РВК Валасевіч.

МАРШРУТЫ БУЛЬБЫ ПРАСОЎВАЦЬ у пралетарскія цэнтры З МАКСЫМАЛЬНАЙ ХУТКАСЬЦЮ

Баявы экзамэн

Адгрузка бульбы для ЛВО праходзіць незадавальняюча. Асноўныя раёны, якія выконваюць самыя большыя пляны, як напрыклад, **Дуброўенскі, Клічаўскі, Асіпавіцкі** і **Буда-Кашалёўскі,** злачынна зрываюць плян.

Клічаўская кантора БНГ да 25 кастрычніка выканала свой плян на 42 проц. За апошнюю пяцідзеўку адгружана толькі 45 тон.

Дуброўенская кантора выканала свой плян на 35 проц. Асабліва адстаюць Расасенскі, Кляноўскі, Верацейскі і Дабрынскі сельсаветы. Да 12 кастрычніка па гэтых сельсаветах нават пляны ня былі даведзены да двароў. Ніякай масавай работы не вядзецца. Адсюль і ганебнае адставаньне.

Некаторыя ўпаўнаважаныя РК і РВК прыяжджаюць у сельсаветы на два дні і не праводзяць ніякай канкрэтнай работы зноў варочаюцца ў раённы цэнтр.

Грашовая запазычанасьць здатчыкам па Дуброўенскай канторы БНГ складае 5 тыс. руб.

Чавускі і Ўваравіцкі раёны ў апошнюю пяцідзеўку зусім нічога не адгрузілі.

Жлобінскі раён толькі з 20 кастрычніка пачаў выконваць свой плян, адгрузіўшы за цэлую пяцідзеўку ўсяго 30 тон.

У Дзяржынскім раёне з 10 па 19 кастрычніка чамусьці зусім не грузілі бульбу.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што пакаранныя раёны яшчэ не паставілі ў цэнтры сваёй работы пытаньне, аб своечасовым выкананьні пляну адгрузкі бульбы Ленінграду, не дабіліся ў гэтай справе належнага пералому.

Асабліва адказная задача ўскладаецца на транспарт, які павінен зьнішчыць усе торма зы на шляху прасоўваньня эшалёнаў у Ленінград. Вагоны павінны падавацца без затрыманьня.

Апошняя рашаючая пяцідзеўка зьяўляецца баявым экзамэнам для кожнай раённай партыйнай арганізацыі. Усе раёны павінны раўняцца па Лельчыцкім і Лагойскім раёнах, якія па-ўдарнаму датэрмінова выканалі свой плян. Т.

Сваячасова падаваць вагоны

ВІЦЕБСК.

Дрэнная пастаноўка работы на Віцебскай чыгуначнай таварнай станцыі яўна тармозіць своячасовую адгрузку бульбы Ленінграду. Замест таго, каб выгружць спэцыяльны пакгаўз для прыёмкі бульбы, гэта адказная функцыя ўскладзена на пакгаўз № 4, які і так да адказу загружан рознымі таварамі, прыбываючымі на станцыю Віцебск. Між тым, побач з пакгаузам № 4 ёсьць пусты пакгаўз, прызначаны для прыёмкі паракняку, які можа быць прыстасаваны для прыёмкі бульбы.

З-за адсутнасьці месца ў пакгаузе, калгасьнікам прыходзіцца шмат часу траціць чакаючы прыёмкі бульбы. 24 кастрычніка больш 20 фурманак прастаялі 5 гадзін у чаканьні месца для ссыпкі бульбы.

Больш таго. Бульба, якая ўжо ёсьць у пакгаузе, своечасова грузіцца ў вагоны, бо Віцебскае адказнае Белплодагароднінны да гэтага часу яшчэ не заключыла дагавору з пагрузачнай канторай таварнай станцыі на рабочую сілу для пагрузкі бульбы ў вагоны. У выніку 5 вагонаў бульбы, якія знаходзяцца ў пакгаузе больш трох дзён не пагружаюцца ў вагон.

Віцебская РСІ і пракуратура павінны прыцягнуць да суровай адказнасьці тых, што тармозяць своячасовую адгрузку бульбы Ленінграду. Баявы загад ураду аб забесьпячэньні пралетараў Ленінграду бульбай павінен быць па-бальшавіцку выкананы.

Брыгада «Зьвязды»
Зарубежны, Узьдзін, Сакалоў.

Указаўказаваны Ленінградзкага абласткому партыі Маргачоў.

ХОД АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ

(у тысячах тон на 27 кастрычніка)

НАЗВА ЗАГАТОЎЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ	ПЛЯН	Адгружана з пачатку кампаніі	Процант выкананьня
Белкаапплодагародніна	125	68,3	54,6
Белплодагародніна	66	27,0	41.0
РАЗАМ	191	95,3	49,9

Магілеўскі вузел тармозіць адгрузку

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.).

Магілеўскі раён павінен адгрузіць пралетарскім цэнтрам 2.650 тон бульбы. На 20 кастрычніка райзагам плян выканан на 39 проц., канторай белплодагароднінны—на 44 проц.

Калі некалькі дзён таму назад паасобныя работнікі сельсаветаў адгаварваліся тым, што бульба яшчэ ня выкапана, дык зараз гэты матыў ніяк ня можа быць прыняты пад увагу, бо раён ужо ў асноўным поўнасьцю закончыў капаньне бульбы.

Асноўная прычына ганебнага адставаньня—слабая масавая работа вакол бульбазагатовак. Няма належнага націску на кулака, які вядзе агітацыю супроць загатовак.

Вопыт перадавых калгасаў і паасобных вёсак паказвае, што там, дзе партыйныя, камсамольскія арганізацыі паставілі асноўнай задачай 100 проц. выкананьне пляну бульбазагатовак, гэты плян ня толькі выкананы, але і перавыкананы. Напрыклад, калгасы імя Леніна, «Чырвоная зорка», «Камінтэрн» і «Чырвоны партызан», Вендараскага сельсавету, ужо на 20 кастрычніка поўнасьцю закончылі адгрузку бульбы.

Калгас «Шлях сацыялізму», Хрыпялеўскага сельсавету, яшчэ 13 кастрычніка выканаў поўнасьцю свой плян. Калгас «1 мая», Вішаўскага сельсавету, да 10 кастрычніка адгрузіў 290 цэнтн. бульбы замест 288 паводле пляну.

З 29-ці сельсаветаў толькі чатыры—Сялецкі, Чорназемаўскі, Вішаўскі і Вендараскі больш-менш здавальняюча выконваюць свае пляны.

«Зьвязда» пісала ўжо аб тым, што раённыя арганізацыі дапусьцілі рад чамыляк у правядзеньні плянаў па калгасаў і што ў раёне няма націску на кулацка-заможныя гаспадаркі. Але памылкі дагэтуль ня выпраўлены.

Раённыя загатоўчыя арганізацыі, асабліва дайза не перабудавалі сваёй работы ў сэнсе лепшага абслугоўваньня здатчыкаў. Апошнім прыходзіцца вельмі часта чакаць па некалькі гадзін пакуль у іх прымуць бульбу.

Значна тармозіць своячасовую адгрузку бульбы **чыгунка.** Магілеўскі чыгуначны вузел дагэтуль працуе з перабоямі. Ёсьць рад фактаў, калі на пунктах затрымлівалася адгрузка з-за непадачы вагонаў. На Лукалаўскай, Вендараскай станцыях і інш. пунктах адгрузкі быў рад выпадкаў, калі бульба ляжала па некалькі дзён з-за непадачы вагонаў.

Бюро раённага камітэту партыі абвясьціла штурм ліквідацыі прарыву па бульбазагатоўках, мабілізавана група адказных працаўнікоў, якія накіраваны на адгрузачныя пункты для ўмацаваньня работы. Райком камсамолу мабілізаваў 130 камсамольцаў. Бюро райкому дало дырэктыву ўсім партыйным арганізацыям да першага лістапада скончыць адгрузку бульбы пралетарскім цэнтрам.

М. Найдзін.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

БЕЛСКУРТРЭСТ ДРЭННА КІРУЕ РЫМАРНАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦЮ

10 тысяч чалавека-гадзін прастою

МАГІЛЕЎ. (Наш. кар.). Рымарная фабрыка зьяўляецца адзінай фабрыкай у БССР, якая вырабляе розную вупраж. З дробных саматужных майстэрань яна ператварылася ў буйнае прадпрыемства, якое налічвае зараз зьыш 500 чал. рабочых. Фабрыка мае нядрэннае мінулае. Прамфінплян 1931 году яна выканала на 16 дзён раней тэрміну, выпусьціла прадукцыі больш, чым на 7 млн. руб.

У 1932 годзе фабрыка пачала здаваць тэмпы. Першыя тры кварталы далі яўна нездавальняючыя вынікі. Вытворчая праграма выканана толькі на 54 проц. Фабрыка недадала дзяржаве больш як на 3 млн. руб. прадукцыі. У чацьвертым квартале тэмпы работы засталіся на адным узроўні.

Прычыны адставаньня крыюцца ў тым, што **Белабуттрэст, скураны трэст** і кіруючыя раённыя арганізацыі недаацэньваюць ролі фабрыкі. Замест дапамогі і канкрэтнага кіраўніцтва фабрыка атрымлівае бюракратычныя адказы. На просьбу дырэкцыі фабрыкі аб высылцы прадстаўніка трэсту для вырашэньня некаторых пытаньняў і дапамогі ў працы, дырэктар абутковага трэсту тав. **Шэрман** паведаміў: **«Апарат перагружан работай, нікога выслаць не магу».**

Кіраўніцтва фабрыкі спасавала перад труднасьцямі і не праводзіць ніякай арганізацыйна-масавай работы. У выніку па фабрыцы няма ні аднэй гаспадарча-разрахунковай брыгады. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута.

Невыстарчальная работа па паляпшэньні рабочага снабжэньня і дрэнная работа сталоўкі выклікалі на фабрыцы вялікую цякучасьць рабочай сілы. За 9 месяцаў прынята 257 рабочых, а пакінула фабрыку 380.

Партыйна-масавая работа не разгорнута. Няма правільнай расстаноўкі партыйных сіл. Асноўныя вытворчыя вучасткі не ахоплены партыйным кіраўніцтвам. У хамутным цэху, напрыклад, дзе працуе 115 рабочых, ёсьць усяго толькі два камуністы.

Зусім мала аддае ўвагі фабрыцы Магілеўскі райком партыі. Ужо больш як паўтары месяцы парткалектыў фабрыкі ня мае сакратара. Ёсьць пастанова аб вылучэньні апошняга, але і да гэтага часу яна засталася на паперы.

Значна перашкаджае нармальнай рабоце фабрыкі невыстарчальнае снабжэньне сырцом. Па пляну фабрыка павінна была атрымаць у трэцім квартале 60.000 мэтраў тасьмы, выдана прадаў на 18.650 мэтраў. Вяровак патрэбна 9.000 мэтраў, запаражана 6.000. Рознай пражы трэба 385.000 мэтраў, дан нарад на 183.000.

Для вырабу хамутоў фабрыка павінна была атрымаць ад беларускага аддзяленьня **Лесдрэўхэмсаюзу** 5.000 пар балванак, фактычна-ж атрымана ўсяго 10.000. Менская лямцавая фабрыка недадала 7.457 лістоў лямцу.

Фабрыцы неабходна 350 тон саломы, але і дагэтуль не загатоўлена ні адной тоны, нават не атрыманы яшчэ нарады.

З прычыны розных вытворчых непаладак і дрэннага снабжэньня сырцом, у трэцім квартале фабрыка прастаяла 10.000 чалавекагадзін.

Раней фабрыка мела свой сырамятны цэх, які забясьпечваў яе ў выстарчальнай меры сырамяцьцю. У ліпені месяцы цэх порайшоў у веданьне Белскуртрэсту. У выніку фабрыка робіць шмат прастояў з-за адсутнасьці сырамяці.

Далей у такім становішчы фабрыка заставацца ня можа. Неабходна зараз-жа вырашыць пытаньне, хто адказвае за снабжэньне сырцом фабрыкі. Абутковы і скураны трэсты БССР і магілеўскія раённыя арганізацыі павінны ўзмацніць кіраўніцтва фабрыкай з тым, каб прадпрыемства, якое вырабляе прадметы шырокага спажываньня працавала бесьперабойна.

Нэйдлін.

Работа па старому— прычына адставаньня

Бабруйскі машына-будаўнічы завод імя **Сталіна** апынуўся ў глыбокім тыле па выкананьні прамфінплану. Праграму трэцяга кварталу ён выканаў толькі на 55,5 проц.

Галоўная прычына гашебнага адставаньня — вялікая цякучасьць рабочай сілы, якая выклікана пануючымі адносінамі да палепшанага снабжэньня рабочых. На заводзе да гэтага часу няма сваёй сталоўкі, рабочыя абедаюць у сталоўках ЦРК. Лёрок, які ёсьць на заводзе, працуе зусім дрэнна. Самазагатоўкамі ніхто не займаецца. Кіраўніцтва ЗРК ня лічыць сваім абавязкам займацца гэтым пытаньнем. Для сьпімаадкормачніка закуплена 4 парасят, для трусатніка 13 трусоў і на гэтым гора-піраўнікі ЗРК мяркуюць спыніцца.

Ня глядзячы на тое, што завод аднесен да прадпрыемстваў цяжкай прамысловасьці, рабочыя снабжаюцца ўвесь час па 2-м сьпісе першай катэгорыі, у той час, як павінны былі забясьпечвацца па першым сьпісе.

Бічом прадпрыемства зьяўляецца ўраўніўка ў зарплаце. Майстры і загадчыкі цэхаў да гэтага часу атрымліваюць адзінакавую зарплату. Расцэнкі ўстанаўліваюцца на вока, бяз усякага тэхнічнага іх абгрунтаваньня, з-за чаго часта бываюць факты калі рабочыя адмаўляюцца выконваць пасобныя работы. Нярэдкі і такія выпадкі, калі майстры не даюць працы рабочым, матывуючы гэта тым, што работа, якая ёсьць, не адпавядае разраду рабочага і апошні вымушан рабіць прагул. Значная частка прастояў бывае з-за несвачасовай падачы дэталяй і сырцу ў цэхі і брыгады.

Не дабіта канчаткова і абязьлічка ў адносінах да машын. Наасобныя вытворчыя працэсы і варштаты не замацаваны за пэўнымі брыгадамі і рабочымі, прамфінплян не даведзен да варштатаў і брыгад.

Ніякай масава-выхаваўчай працы спрод рабочых не праводзіцца. Адміністрацыя, партыйная і прафсаюзная арганізацыі заводу не вядуць барацьбы за зьніжэньне непаладак, якія ёсьць на заводзе.

Белмэталяаб'яднаньне на чацьверты квартал зрабіла палёгку, зьменшыўшы плянавае заданьне на выпуску прадукцыі на 60.000 руб. Зусім выкрэслен з пляну выраб капітоўнейшых машын (розацельных паўаўтаматаў), якіх раней увойшло з-за-мяжы, між тым, як па выраб іх патрэбна зусім нязначная колькасьць мэталю. З прычыны гэтага запрасектаваны выраб трох розацельных паўаўтаматаў на 4-ты квартал сарваны.

Белмэталяаб'яднаньню і трыкутніку заводу трэба заняцца перабудовай работы на заводзе з тым, каб у чацьвертым квартале поўнасьцю пакрыць запазычанасьць.

В.

40 ткачоў перавыконваюць вытворчае заданьне

Якаўлевіцкая суконная фабрыка (Аршанскі раён) у першым паўгодзьдзі выканала свой прамфінплян на 70 проц. У трэцім квартале справа значна палепшылася. У адказ на ліст ленінградзкіх рабочых, калектыў фабрыкі мабілізаваў свае сілы на павышэньне тэмпаў работы. У выніку верасьнёўскі плян выкананы на 101 проц. Першая дэкада кастрычніка дала 103 проц. вытворчага заданьня.

Асобныя рабочыя паказваюць сапраўды ўдарныя тэмпы работы. **Зараз выконваюць свае вытворчыя заданьні 40 ткачоў.** Лепшыя ўдарнікі — **Панкратаў, Сафрановіч, Рэпаляза і інш. даялі выкананьне вытворчых заданьняў да 130 проц.**

На фабрыцы ёсьць 240 рабочых, з якіх ахоплены сацспаборніцтвам 193. Дрэнна толькі тое, што ўдарніцтва недаацэньваецца грамадзкімі арганізацыямі. У сталоўцы не арганізован стол ударнікаў, недавальняюча наладжана культурнае абслугоўваньне.

Фабрыка рыхтуецца сустрэць XV гадавіну Кастрычніка па-ўдарнаму, з перавыкананьнем прамфінплану. Да кастрычніцкіх дзён прыстасоўваецца засяленьне рабочымі 2-га вярховага дому, адкрыцьцё дзіцячых ясьляй і інш.

Міхась Вясновы.

ДНЯПРОЎСКУЮ ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫЮ БУДАВАЎ УВЕСЬ САЮЗ

Прамова старшыні ЦВК Саюзу ССР М. І. Калініна на мітынгу пры адкрыцьці Дняпроўскай гідраэлектрастанцыі 10 кастрычніка 1932 г.

Таварышы, сёньня сьвята ўсіх працоўных Саюзу ССР. Мы адкрываем Дняпроўскую гідраэлектрастанцыю, якая ўяўляе па ват для сучаснай тэхнікі цуда інжынэрнага майстэрства. На яе патрачана вялізарная колькасьць матар'яльных сродкаў, працы, інжынэрных ведаў і партыйных памаганьняў.

Вітаю рабочых, будаўнікоў станцыі, тэхнічны нарсанал, прафэсыянальныя, партыйныя арганізацыі, мінтэра Купэра са штатам замежных спэцыялістаў, кансультатаваўшых, дапамагаўшых будаўніцтву, вітаю са сканчэньнем, з дасканалым сканчэньнем гэтага грандыёзнага будаўніцтва. Таварышы, гэта дасягнута волай рабочай клясы Саюзу ССР пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, на чале з тав. Сталіным.

Дняпроўскую станцыю будаваў увесь Саюз, але талоўнымі, практычнымі выканаўцамі волі працоўных Саюзу зьяўляюцца перш за ўсё рабочыя Украіны, і ўзнагародай іх вялізарных намаганьняў мы бачым пабудову, якая далей ярушыць тэхнічную мысьль і ўзьніме на большую вышыню індустрыялізацыю Украіны, а тым самым усяго Саюзу ССР.

Недалёка ад электрастанцыі, на выходзячы з поля нашага зроку, расьце камбінат з раду капітоўнейшых заводаў: домны, марсканы, электрасталь, пракат з вышэйшых гатункаў сталі, алюміневы, фэрамарганцавы і г. д. Уся гэта вытворчасьць дае магчымасьць узмацніць аўтатрактарнае будаўніцтва і тым самым яшчэ вышэй узьняць сельскую гаспадарку.

Мне-б хацелася ўказаць, што Дняпроўскае будаўніцтва адзначаецца добрай арганізацыяй, і, несумненна, яго вопыт будзе выкарыстан і дастасаваны на нашым фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Таварышы, капіталістычны сьвет б'ецца ў цёскох крызісу, яго гаспадарка дэградуе, фабрыкі і заводы руйнуюцца з-за іх бескарыснасьці і непатрэбнасьці, мільёны беспрацоўных, не знаходзячы прыстасаваньня сваіх сіл, галадаюць. Толькі ў Савецкім Сацыялістычным Саюзе пралетарыят ператварае свае ідэі ў жыцьцё, стварае камунізм і тым самым набліжае дзень яго перамогі ва ўсім сьвеце.

Дняпроўская электрычная станцыя ўрадам залічана ў лік дзейнічаючых прадпрыемстваў пад назвай **Дняпроўскай гідраэлектрычнай станцыі імя Леніна.**

ТРАКТАР—АСНОВА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Прамова старшыні ЦВК СССР тав. М. І. Калініна на Харкаўскім трактарным заводзе пры ўзнагародзе ордэнам Леніна работнікаў заводу 21 кастрычніка 1932 г.

Таварышы! Я дазволю сабе сказаць некалькі слоў нагоды вашай узнагароды. Вітаю вас з атрыманьнем узнагароды ад рабоча-сялянскага ўраду, а тым самым ад рабочых і сялянскіх мас Саюзу. Спадзяюся, што гэта ўзнагарода будзе вам служыць новым стымулам да далейшай работы. Узнагароджваючы ХТЗ, урад тым самым узнагароджвае ўвесь калектыў рабочых—удзельнікаў гэтага будаўніцтва.

Я думаю, што вы, як будаўнікі і як вытворцы гэтага заводу, добра разумееце, што трактарная вытворчасьць — вядучая частка індустрыялізацыі нашай сельскай гаспадаркі. Калі без якой-небудзь машыны яшчэ можна абыйсьціся або яе можна замяніць, то вы самі разумееце, што бяз трактара ня мысьліцца індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі.

Што-б мы ні таварылі, але калі мы будзем будаваць індустрыялізацыю сельскай гаспадаркі бяз трактара, гэта будзе толькі фантазія, гэта будуць толькі словы, гэта будзе толькі ілюзія, а індустрыялізацыі ня будзе.

Аснова індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі—трактар.

Наша краіна, якая робіць надзвычай вялікія намаганьні для таго, каб быць індустрыяльнай краінай, разам з тым зьяўляецца вялізарным вытворцам сельска-гаспадарчых прадуктаў. Выраб гэтых прадуктаў ня менш важны, чым выраб прамысловых тавараў. Каб задаволіць вялізарныя запатрабаваньні, якія зараз прад'яўляюцца да нашых сельска-гаспадарчых прадуктаў, каб задаволіць запатрабаваньні значна ўзросшага насельніцтва мы павінны, побач з разгортваньнем індустрыялізацыі, змагацца за тэхніч[illegible] ўзбраеньне сельскай гаспадаркі, за высокую якасьць працоўкі сацыялістычных палёў.

[illegible]д узнагар[illegible]ае вас, ён хоча паказаць рабочым і сялянам нашай краіны ўсю важнасьць вашай вытворчасьці.

Таварышы, мы часта таварым, што мы аддамо ўсё наша жыцьцё, усю сваю волю, энэргію, усе сілы на пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Як мысьліцца бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва? Яно мысьліцца, па-першае, як перамога рабочых, фізычная перамога над буржуазіяй і затым сыстэматычная сваіня ў дзень перамога над сіламі прыроды. Калі вы пагледзеце хоць-бы за апошнія пяць год на посьпехі ў аўладаньні сіламі прыроды, то ўбачыце, што гэтыя посьпехі вельмі і вельмі значныя. Гэта даказвае, што прадукцыйныя сілы чалавека і навуковае дасягненьні ў галіне вытворчасьці так выраслі і так падрыхтаваны да новага эраду, што наша пралетарская дзяржава яшчэ нявысокая на сваёй арганізацыі навуковай падрыхтоўкі рабочай клясы, захапіўшая ўладу ў краіне з вельмі адсталай тэхнікай, усё-ж і пры гэтых абставінах разьвівае індустрыялізацыю краіны, ахапляе і падчальвае сабе сілы прыроды.

Саюз ССР у галіне прамысловасьці зрабіў такія посьпехі, што здолеў перавысіць любую з капіталістычных дзяржаў,—гэта значыць, што чалавецтва рушыцца наперад, заваёўвае сілы прыроды, падчальвае іх у інтарэсах чалавека ў цэлым толькі ў сацыялістычнай дзяржаве.

Вы, атрымаўшыя ўзнагароду, зьяўляецеся самымі шчасьлівымі людзьмі. Ня толькі таму шчасьлівымі, што вы атрымалі ўзнагароду ад адзінага ўраду ў сьвеце, які зьяўляецца прадстаўніком рабочай клясы і ўсіх працоўных, але яшчэ і таму, што вы зьяўляецеся тварцамі сацыялізму, што кожная ўкладзеная цэгла, кожная скончаная работа, усе дасягненьні на вашым гаспадарчым фронце—усё гэта абгрунтоўвае, асьвятляе і адухатварае магутную ідэю барацьбы за сацыялізм, за лепшую будучыню ўсяго чалавецтва.

Калі вы адчуваеце, што вас узнагароджваюць імянна за гэта, што вы зьяўляецеся камандзірамі, кіраўнікамі баявога атраду, які змагаецца за вызваленьне чалавецтва ад ланцугоў капіталізму, тады вы адчуваеце сябе задаволенымі. Якая можа быць большая задаволенасьць, якая можа быць больш адухатворная работа, чым тая, якую вы видзеце!

Таму я вітаю вас і радуюся разам з вамі, што вы аказаліся ў такім шчасьлівым становішчы. Несумненна, што вы, таварышы, атрымаўшыя зараз узнагароду, маеце магчымасьць разгарнуць свае творчыя сілы ў інтарэсах пралетарыяту.

Усё гэта ёсьць результат правільнай лініі партыі, усё гэта ёсьць результат таго сьветапогляду, які праводзіць наша камуністычная партыя. Яшчэ раз вітаю вас, таварышы, і радуюся з вамі.

Няхай жыве камуністычная партыя!

Няхай жыве тав. Сталін—выяўнік і практычны правадзік ідэй нашай партыі! (**Аплёдысмэнты**).

Разгарнуць ударную падрыхтоўку да 3-га ўсесаюзнага конкурсу спараных і вагонна-рамонтных брыгад

Рабочыя, ІТР і служачыя Маскоўска-Курскай чыгункі ў сваім лісьце да ўсіх чыгуначнікаў СССР 15-га кастрычніка пісалі: «Перад тварам 15-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі і другой вялікай пяцігодкі чыгуначнікі павінны сабраць усе свае сілы, усе свае веды і з бальшавіцкай упартасьцю пачаць рашучую барацьбу за аздараўленьне вядучых зьвеньняў транспарту—паравознай і асабліва вагоннай гаспадаркі».

Рабочыя зьвярнуліся ў «Правду», НКПШ, ЦК чыгуначнікаў і «Гудок» з просьбай «для паспяховай рэалізацыі пастаноў сьнежаньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і 100 проц. выкананьня плянаў асеньня-зімовых перавозак дапамагчы ўзьняць спаборніцтва, абвясьціць зноў новы конкурс спараных брыгад пры абавязковым удзеле работнікаў вагоннай службы».

Заклік рабочых Маскоўска-Курскай чыгункі, як і заклік ленінградзкіх рабочых, сустрэў жывы водгук сярод чыгуначнікаў СССР, у тым ліку і чыгуначнікаў Савецкай Беларусі. Па большасьці вузлоў БССР чыгуначнікі адказалі на лісты ўзяцьцем раду канкрэтных самаабавязацельстваў па аздараўленьні транспарту. Ёсьць ужо і практычныя вынікі рэалізацыі абавязацельстваў. У Гомелі і Воршы ёсьць рост здаровых паравозаў і вагонаў і г. д.

Сходы чыгуначнікаў аднадушна ўхвалялі просьбу рабочых Маскоўска-Курскай аб арганізацыі конкурсу.

Улічваючы вялізарныя посьпехі першага і другога ўсесаюзных конкурсаў спараных брыгад, «Правда», НКПШ, ЦК чыгуначнікаў і «Гудок» 24 кастрычніка абвясьцілі трэці ўсесаюзны конкурс спараных і вагонна-рамонтных брыгад імя 15-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Старт конкурсу—1 сьнежня г. г. Фініш—1 лютага 1933 г. Да 25 лістапада праводзіцца кампанія ўдарнай падрыхтоўкі да конкурсу, адборачныя спаборніцтвы лепшых брыгад на права ўдзелу ў конкурсе. Адначасова павінны праводзіцца таксама і месцовыя конкурсы. Умовы усесаюзн. спаборніцтва паравозных брыгад тыя-ж самыя, што і на другому конкурсу. Асноўная ўмова спаборніцтва вагоньнікаў—сваячасовы і добраякасны рамонт вагонаў.

Посьпех конкурсу будзе забясьпечан пры належнай дапамозе работнікаў іншых служб транспарту (начальнікаў станцый, дыспэтчараў, дзяжурных дэпо і г. д.). Умовы конкурсу прадугледжваюць спэцыяльнае прэміяваньне работнікаў іншых служб, партыйных прафсаюзных і камсамольскіх работнікаў, якія акажуць самую актыўную дапамогу ў спаборніцтве. Агульны прэміяльны фонд вылучан у суме 1 млн. руб. Дано права змагацца за ўсесаюзнае пярэдніцтва ўсім паравозьнікам і вагоньнікам СССР, якія спаборнічаюць на месцовых конкурсах. Матар'ялы лепшых разглядаюцца і прэміяваньне праводзіцца адначасова з удзельнікамі ўсесаюзнага конкурсу.

Задача чыгуначных арганізацый заключаецца ў тым, каб неадкладна разгарнуць ударную падрыхтоўку да конкурсу, якая дасьць новы ўздым сацыялістычнага спаборніцтва. Кандыдатуры паравозьнікаў і вагоньнікаў павінны, як правіла, абгаварвацца на сходах паравозных брыгад, рабочых, дэпо, абменных і рамонтных пунктаў.

Прашоўшыя першы і другі конкурсы спараных брыгад далі значныя вынікі па радзе дэпо БССР (Гомель, Асіповічы, Борша) у справе аздараўленьня паравознага парку. Рад паравозных брыгад занялі перадавыя месцы па ўсесаюзным конкурсе. Задача трэцяга конкурсу **даць поўнае аздараўленьне як паравознага, так і вагоннага парку.** Чыгуначнікі БССР павінны на-бальшавіцку змагацца за рэалізацыю закліку рабочых Маскоўска-Курскай чыгункі: **«Прывядзем, таварышы, са[illegible]спарт да гістарычнага фінішу нашага спаборніцтва—да пачатку другой сацыялістычнай пяцігодкі, пад кіраўніцтвам нашай партыі і яе ЦК, на чале з тав. Сталіным, да новых перамог. Агульнымі сіламі выцягнем сацыялістычны транспарт з «вузкага месца» і падыдзем яго работу да ўзроўню перадавых галін нашай народнай гаспадаркі».**

Р.



Першы звышмагутны пасажырскі паравоз тыпу 1-4-2, выпушчаны Каломенскім з-дам.

А. В. Зянюк

Глебавая хвароба на асушаных тарфяніках

У сувязі з вялікарным размахам асушальных работ на балотных масывах у розных вобласьцях нашага Саюзу, з мэтай арганізацыі па іх буйных сацыялістычных гаспадарак рознага напрамку, неабходна завастрыць увагу на адным з адноўных зьявішчаў, е якім часта прыходзіцца мець справу па асушаных «тарфяніках», — **глебавай хваробе «апрацоўкі».**

Глебавая хвароба «апрацоўкі» сустракаецца ня толькі на асушаных тарфяніках, але жыве і на рэдкай забалочаных, але асушаных лясках і гліцах, дзе ў верхнім гарызонце наглядаецца накапленьне арганічных матэрый. У выпадку ўвядзеньня ў культуру такіх мінэральных глеб на іх ня рэдка можна сустрэць хваробу «апрацоўкі».

На асушаных тарфяніках гэта хвароба адаўно была заўважана ў Германіі і Галяндыі.

Апрача назвы хваробы «апрацоўкі» яна таксама мае і іншыя назвы: хвароба верашчатнікаў, паколькі яна праяўляецца даволі рэзка на тарфяніках, якія да асновы пакрыты вераскамі, і белая чума — так яна даўно была названа нямецкімі сялянамі за раптоўнае набяленьне і засыханьне кончыкаў ліставой пласьцінкі.

Паводле ўказаньня **Радамахэра** (Германія) хвароба «апрацоўкі» асабліва праяўляецца на балотах пакрытых вераскамі, прычым у стваренай торфу прыкме ўдзел у асноўным вераск. Магутнасьць торфу па гэтых балотах даволі моцна хістаецца, але большай часткай яна нязначна. Зразумела, апрача гэтых тыпаў балот хвароба сустракаецца і на іншых тыпах, аднак, пэўная сувязь хваробы з торфаўтвараючай флёрай да гэтага часу ня вызначана.

Актыўная кісьлотнасьць вучасткаў, дзе пануе хвароба, лежыць паміж 5,1 — 6,9 р. Н.

З пустазельля на вучастках у сувязі з хваробай буйна разьвіваюцца гарчак, лебяда і крапіва, побач з гэтым пустазельлем, сустракаецца яшчэ і цэлы рад іншых.

Хаця хвароба моцна праяўляецца звычайна ў першыя гады культуры тарфяніку, аднак, у значнай ступені яе знаходзяць па тарфяніках, якія на працягу доўгага часу культывуюцца.

Найбольш рэзка хвароба праяўляецца па яравых злаках, — ячмені, асабліва двухрадовым, пшаніцы, аўсе і жыце. З азімых вольні церніць пшаніца, больш устойлівым зьяўляецца жыта. З іншых культур схільны да хваробы конскія бабы, белая гарчыца, рыжык і лён. Найбольш устойлівымі культурамі супроць хваробы «апрацоўкі» зьяўляюцца канопля і бульба. Травы хаця і ня так церпяць ад гэтай хваробы, але ўсё-ж па вучастках, дзе яна мае месца, ураджаі атрымліваюцца паніжаныя.

На збожжавых злаках, напрыклад, на ячмені, хвароба пачынаецца з раптоўнага набяленьня і засыханьня кончыкаў лёта, пры чым засохшыя кончыкі захоўваюць белаватую афарбоўку. Звычайна спачатку ўсходы разьвіваюцца нармальна і хвароба праяўляецца толькі пачынаючы з 5-6 тыдзёвага ўзросту.

Захваробўшыя расьліны надаюць усяму полю сьветла-зялёнае адценьне. Гэта першае праяўленьне хваробы і далейшае яе разьвіцьцё знаходзіцца ў сувязі з умовамі падвор'я. Сухое падвор'е ўзмацняе хваробу, пры дажджлівым-жа падвор'і на маладых расьлінах хвароба аслабляецца.

На вучастках, дзе хвароба шпаркі разьвіваецца, расьліны пачынаюць узмоцнена кусьніцца — мяцёлкі (у аўса) і калосьсі (у іншых злакаў) ня выходзяць з лістовых улагалішчаў (асабліва ў ячмені і пшаніцы) і ўсё сьпяблo паступова засыхае. Некаторыя-ж расьліны частковае або цалкам выкідваюць мяцёлку ці колас.

Хворыя расьліны ў параўнаньні са здаровымі значна ніжэй, прычым большасьць сьцяблоў застаецца зялёнымі да моманту ўборкі і ня маюць ніякага ўраджаю збожжа.

Такім чынам, на вучастках з глебавай хваробай «апрацоўкі» назіраецца пераход ад расьлін, якія зусім ня выкаласіліся, да расьлін з добрымі мяцёлкамі, каласамі.

Прычына гэтай хваробы недаволі ясная. Па думцы некаторых дасьледчыкаў хвароба «апрацоўкі» выклікаецца прысутнасьцю ў тарфяніку асобных шкодных для расьлін матэрый. Але гэты погляд некалькі пахіснуты работамі праф. Такке, у якога ў вопыце гэтыя матэрыі атрутнага дзеяньня амаль не стварылі.

Магчыма, што праф. Такке для вывучэньня ўплываў гэтых матэрый на авёс быў узят гатунак аўса нараўмальна ўстойлівы супроць хваробы «апрацоўкі», бо ягодна нашых вопытаў з ячменем аказалася, што хвароба розна ўплывае на асобныя гатункі ячменю.

Доўгі час хваробу «апрацоўкі» зьмешвалі з пашкоджаньнямі ад замаразкаў, бо па сваіх знадворных адзнаках яна нагадвае іх. Бывае, што засыханьне расьлін тлумачаць перасушкай балот, а не хваробай, прычым на такія нібы перасушаныя балоты даволі ўнесьці мednага купарвасу, як расьліны нармальна разьвіваюцца.

Больш павышанае і расьцягнутае нутчэньне збожжа на вучастках з хваробай «апрацоўкі» стварае сарыяючыя ўмовы шведжай мушцы для адкладваньня яек на падсеўе. Апошняе трэба адзначыць, бо часта энтамолёгі, на падставе палёку пашкоджаньняў шведжай мушкай, бачаць у ёй асноўнага вінаватага засыханьня расьлін, а ня ў іншых, пакуль што невыстарчальна вывучаных глебавых умовах.

Сродкамі барацьбы з хваробай «апрацоўкі» зьяўляюцца:

1. Унясеньне ў балотную глебу раньняй вясной за 15-30 дзён да пасеву аэробнага крышталянага мednага купарвасу з разлікам 25-30 кг. па гэктар, як дабаўкі да асноўнага ўгнаеньня, прычым пасеў адразнай культуры павінен быць праведзен у нармальны тэрмін без спазьненьняў.

2. Дастасаваньне ў якасьці ўгнаеньня кампостаў, выробленых з гарадзкога сьмецьця (хатняе, вулічнае сьмецьце, фэкальныя адкіды).

3. Дастасаваньне рафаніта (азотна-кіслай меды), які, паводле апошніх опытаў у Германіі, дае добрыя вынікі ў барацьбе з хваробаю.

Усесаюзным балотным інстытутам вядзецца рад прац па пытаньнях, зьвязаных з хваробай «апрацоўкі». Якія-ж вынікі гэтых прац для асобных культур?

Ячмень — медны купарвас вывучаўся, як дабаўка да калі-фасфатнага ўгнаеньня з разлікам 25 кг. на гэктар пад розныя гатункі ячменю. Сярэдняя двухгадовая ўраджай паступлены:

1. Гатунак «Брыё» па адным калі-фасфатным угнаеньні даў 18,2 цэнтн. зерня на гэктар; пры дабаўцы-ж да яго сьледнага купарвасу — 34,9 цэнтн.; 2 гатунак — «Лебядзіная шэя» — па калі-фасфатным угнаеньні — 3,7 цэнтн. зерня па гэктар, па купарвасе — 29,6 цэнтн.; 3 гатунак — «Энгельгардаўскі 10-30» на першай камбінацыі ўгнаеньняў — 6,8 цэнтн. зерня, па другой (з купарвасам) — 15,9 цэнтн. па гэктар.

Цікава адзначыць, што пры вывучэньні вынікаў мednага купарвасу на другі год пасьля ўнясеньня атрымана прыбаўка ўраджаю збожжа гатунку «Лебядзіная шэя» ў 9,1 цэнтн. на гэктар (без купарвасу ўраджай збожжа роўны 6,8 цэнтн. па гэктар, па купарвасу — 19,9 цэнтн.

З аналізаў вынойпаказаных ураджаў троба адзначыць, што розныя гатункі ячменю па-рознаму адносяцца да хваробы «апрацоўкі» пры тэй ступені яе праяўленьня, якая мела месца ў данным выпадку. Розныя гатункі па-рознаму рэагуюць на ўнясеньне мednага купарвасу ў балотную глебу.

Медны купарвас зьяўляецца сродкам барацьбы з хваробай «апрацоўкі», паводле яўных вопытных матар'ялаў, на працягу 2-4 год.

Авёс. Пад уплывам мednага купарвасу пры пасеве аўса ў нармальны тэрмін атрыман ураджай збожжа ў сярэднім за тры гады 21,7 цэнтн. на гэктар, па адным-жа калі-фасфатным угнаеньні — 10,6 цэнтн. на гэктар.

Цікава спыніцца на вопыце галяндзкіх дасьледчыкаў. Пры ўжываньні мednага купарвасу і кампостаў з гарадзкога сьмецьця пры вывучэньні хваробы «апрацоўкі» яны атрымалі паступлены выніку для аўса.

Урадлівай на гэкт. у цэнтн.

№№ п. п.	Камбінацыі ўгнаеньняў	Збожжа	Саломы
1.	Штучнае ўгнаеньне (калі-фосф.)	3,0	24,0
2.	Штучнае ўгнаеньне (мергэль)	5,0	21,5
3.	Гной 40,0 тон на гэктар	9,0	34,5
4.	Штучнае ўгнаеньне (мед. куп.)	15,0	31,5
5.	35,0 тон кампосту	22,0	40,5
6.	70,0 тон кампосту	25,0	40,5

Лён вывучаўся ў 1931 г. у вопыце па вывучэньні вынікаў мednага купарвасу (купарвас быў унесен у 1930 г. вясной). На адным калі-фасфатным угнаеньні ўраджай збожжа быў атрыман 1,3 цэнтн. на гэктар, саломы-ж — 8,5 цэнтн., па мednым купарвасе ўраджай збожжа — 6,7 цэнтн., саломы — 22,2 цэнтн.

Лён аказаўся малаўстойлівай культурай супроць глебавай хваробы «апрацоўкі». Пад уплывам мednага купарвасу атрымана значная прыбаўка ня толькі ўраджаю насеньня, але і саломы. Неабходна адзначыць, што на дзяляках з адным купарвасам, лён амаль што ня ветрыўся ля карнявой шыйкі і нармальна разьвівалася сьцябло, у той час, як бяз мednага купарвасу наглядалася адваротнае зьявішча.

У далейшым пры вывучэньні ільну па асушаных тарфяніках пазнана быць улічана чуласьць ільну да хваробы «апрацоўкі».

Магчыма і гэта, пакуль што рызыкаваная расьліна на балотах, у далейшым пры зьнішчэньні цэлага раду адноўных зьявішч, зьвязаных з яе апрацоўкай, зойме адпаведнае месца ў балотных севазваротах.

Канопля. Гэта культура даволі ўстойлівая супроць хваробы «апрацоўкі». У вопыце на вывучэньні вынікаў мednага купарвасу на Камароўскім балоце (пад Менскам) ураджай саломы без купарвасу роўны 82,9 цэнтн. на гэктар, па купарвасе — 90,0 цэнтн. Устойлівасьць канапель супроць хваробы «апрацоўкі» падмацоўваецца цэлым радам іншых вопытаў.

Травы. Паводле ўказаньня галяндзкага праф. Гудэяг, на травах хвароба праяўляецца па 2-3 годзе жыцьця.

У 1931 годзе на Камароўскім балоце пры вывучэньні вынікаў мednага купарвасу на вучастку з хваробай «апрацоўкі» для першага ўкосу траў (канюшыны — цімафэевічная сумесь) быў атрыман ураджай сухой масы 29,2 цэнтн. на гэктар, па мednым купарвасе — 32,6 цэнтн.

Буль'ба аказалася больш устойлівай супроць хваробы «апрацоўкі». Яна ня толькі не дала ніякай прыбаўкі ўраджаю клубняў пад уплывам мednага купарвасу, але нават выявіла значную тэндэнцыю да зьніжэньня ўраджаю.

Вывучэньне глебавай хваробы «апрацоўкі» па асушаных тарфяніках зьяўляецца адной з асноўных задач балотнага інстытуту. У далейшым неабходна ўвага на вывучэньню цэлага раду пытаньняў, зьвязаных з глебавай хваробай «апрацоўкі». Неабходна дакладна ўстанавіць яе прычыну і падшукаць новыя сродкі барацьбы з ёю.

Дастасаваньне кампосту з гарадзкога сьмецьця абмяжоўвае ня толькі радыус ужываньня гэтага ўгнаеньня, але і магчымасьць забясьпячэньня ім вялікарных балотных масываў, асвоеных сацыялістычнымі гаспадаркамі.

З другога боку, неабходна зьвярнуць увагу на вытворчасьць у выстарчальнай колькасьці мednага купарвасу, таму што пакуль ён зьяўляецца дэфіцытным, а таму ён ня можа быць ужыты ў шырокім маштабе.

Неабходна таксама вылініць у розных геаграфічных зонах рознастайнасьць тарфяніку, на якіх хвароба «апрацоўкі» і пагул іншыя глебавыя хваробы праяўляюцца найбольш выразна, каб пакуль не апрадоўваць па іх сельска-гаспадарчыя культуры, найменш устойлівыя супроць хвароб.

Апрача глебавай хваробы «апрацоўкі» па тарфяніках, як указваюць галяндзкія дасьледчыкі, сустракаюцца яшчэ дзве глебавыя хваробы — хваробы «балотных калёнай» і гогхаленьня.

У далейшым і гэтыя хваробы будуць вывучаны ў балотным інстытуце пры вылічэньні іх на балотных масывах Саюзу. У асаблівасьці, як відаць, будзе мець шырокае распаўсюджаньне «хвароба балотных калёнай» на цэлюлозных балотах.

Больш увагі вывучэньню глебавых хвароб, тасьнхожае мерацыяльне барацьбы з іх дасьць магчымасьць прасунуць на балотнай глебе цэлы рад культур, пакуль яны не асабліва, або зусім не падсёйных для апрацоўкі па ёй.

ПОУНАСЬЦЮ АЖЫЦЬЦЕВЫМ ПАСТАНОВУ ЦВК СССР АБ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ

Праф. А. К. Ленц

НЕКАЛЬКІ ЗАЎВАГ

Неабходнасьць мець для нашай савецкай краіны высокакваліфікаваных спэцыялістаў па ўсіх галінах растучай сацыялістычнай гаспадаркі выклікала да жыцьця пастанову ЦВК Саюзу ССР аб вышэйшай школе.

Гэта пастанова прадугледжвае ўсе тыя сродкі, якія могуць і павінны ўзброіць будучых спэцыялістаў шырокімі і глыбокімі ведамі, разуменьнем сэнсу сацыялістычнага будаўніцтва і ўменьнем злучыць навуковую тэорыю з жыцьцёвай практыкай, каб узьняць агульнаю на вышыню самай перадавой тэхнікі.

Кожны вучоны, кожны выкладчык павінен грунтоўна азнаёміцца з пастановай ЦВК, якая зьяўляецца новым, моцным фундамантам савецкай школы і савецкай асьветы наогул.

Я зараз хацеў-бы зрабіць некаторыя заўвагі па паасобных пунктах пастановы.

Адным з недахопаў нашай вышэйшай школы была адсутнасьць сталых вучэбных праграм. Праграмы-ж зьмяняліся шмат разоў на працягу году і пры тым ні адна з іх не адпавядала сапраўднаму выкладаньню, таму што лік гадзін, значна урэзаны, не даваў магчымасьці выканаць усе пункты праграмы. Па радзе навуковых дысцыплін скарачэньне часу прыводзіла выкладальне да канспэктаваньня данай навукі, а праграма малявалася, як далёкі, недасягальны ідэал. Пастанова ЦВК ясна гаворыць аб неабходнасьці ўзгадніць праграму з прызначаным для яе выкананьня часам і падкрэсьлівае шкоднасьць празьмернай дэталізацыі, каб выкладчык мог правільна выкарыстаць час, зьвяртаючы ўвагу на рашаючыя вучасткі дысцыпліны.

Брыгадна-лябараторны мэтад ў мінулым нярэдка зусім выцясьняў лекцыі. Бывалі выпадкі, калі прафэсар, жадаючы больш падрабязна, у форме лекцыі пагутарыць са студэнтамі аб тэй ці іншай частцы свайго прадмету, спыняў сваё імкненьне, бо не ад важваўся адбіраць час у студэнта, які вылазіў са скуры, каб пасьпець прапрацаваць курс у адведзеныя яму гадзіны. Бывала і наадварот, што кваліфікаваны спэцыяліст пахаджваў вакол студэнтаў, якія старанна зубрылі па падручніку «адсюль» і «дасюль».

Лекцыі адпаўляюцца. Але гэта не зварот да мінулага, да лекцыйнай сыстэмы царскіх унівэрсытэтаў.

Новы мэтад выкладаньня павінен быць актыўным і гібкім. Пастанова ЦВК абавязвае навуковыя ўстановы падыходзіць канкрэтна, улічваючы асаблівасьці вучэбнага матар'ялу, кваліфікацыю выкладчыка, узровень падрыхтоўкі студэнтаў і інш. Далей велімі важная заўвага аб тым, што за лекцыяй прафэсара павінна ісьці грунтоўная прапрацоўка матар'ялу пад кіраўніцтвам асыстэнта і пры абавязковым кантролі прафэсара.

Мне думаецца, што трэба рашуча ўлічваць і, так сказаць, «лекцыйныя здольнасьці» прафэсара.

Ня трэба ў імя лекцыйнага прынцыпу пры мушаць студэнтаў мірна драмаць на лекцыях малаздольных лектароў, хоць-бы яны і былі вельмі паважанымі і добрымі вучонымі. Трэба ва ўсякім выпадку клапаціцца аб дэманстрацыйнасьці і нагляднасьці лекцыі, у сувязі з чым неабходна павысіць адпаведнае абсталяваньне катэдр.

Некалькі слоў аб залініках. Залік ёсьць праверка ня толькі пасьпяховасьці студэнтаў, але таксама і праверка пасьпяховасьці выкладаньня. У часе лекцыі і брыгадна-лябараторных заняткаў павінны выявіцца як зусім непадрыхтаваныя студэнты, якія па падагляду прайшлі добра некалькі дысцыплін, таксама і тыя, якія па больш-менш вы падковых прычынах не спраўляюцца з данай дысцыплінай. Больш шчыльная сувязь выкладчыка са студэнтамі ёсьць магутны сродак для перамогі над «страхам» залікаў.

Неабходнасьць строгай і дакладнай праверкі ведаў не павінна весьці да празьмернай патрабавальнасьці, якая прычыняе «пэўрозы» студэнтаў перад залікам і перашкаджае ўважліваму ўсваеньню прадмета.

Увядзеньне вучоных ступеняў удасканальвае кваліфікацыю вучоных і замацоўвае навуковыя дасягненьні асобы. Тым самым у значнай меры зьнішчаецца ўраўнілаўка навуковых работнікаў і да пэўнай ступені гарантуецца моцная рэпутацыя савецкага вучонага, каштоўнага не на словах, а на справе.

Пастанова ЦВК надзяляе вялікімі правамі прафэсара—загадчыка катэдры, які прызначаецца на пасаду па сапраўднай кваліфікацыі, г. зн. па каштоўнасьці яго навуковых прац. У парадку адзінаначальня ён кіруе работай усіх супрацоўнікаў катэдры, падбірае выкладчыкаў і інш. Савецкі ўрад паказаў гэтай пастановай, што ён давярае савецкім вучоным і спадзяецца, што прафэсары і выкладчыкі выканаюць ускладзеныя на іх ганаровыя абавязкі. Галоўны абавязак—гэта адказнасьць за найвышэйшую якасьць падрыхтоўкі новых кадраў, якія безадкладна патрабуюцца для сацыялістычнага будаўніцтва.

Пастанова ЦВК ясна і цьвёрда вызначае шляхі будучай савецкай вышэйшай школы. Усе савецкія вучоныя павінны прызнаць, што гэтай пастановай пачынаецца новая эра нашай школы. Доказам нашай сумленнасьці і нашых здольнасьцей будзе новы савецкі спэцыяліст, які па сваёй працоўнай якасьці і адданасьці вялікай справе сусьветнага пралетарыяту пакіне далёка за сабой спэцыяліста капіталістычных краін.

Акад. І. Замоцін

ПАТРЭБНЫ ШЫРОКІ АБМЕН ДУМАК

Каб указаньні пастановы ЦВК далі належныя вынікі ў практыцы вышэйшай школы, трэба неадкладна прыступіць да іх рэалізацыі. Гэта рэалізацыя ўжо разгортваецца пазнакам працы выкладчыцкіх калектываў ВНУ пад паасобнымі палажэньнямі пастановы ЦВК. Аднак, нельга разам з тым не падкрэсьліць неабходнасьці ў даным выпадку і індывідуальнай працы паасобных навуковых спэцыялістаў, кожнага на сваёй галіне. Такая індывідуальная праца можа выявіцца, напрыклад, у набудове практыкаў праграм, ва ўвядзе іх з усім пазучальным працэсам па данаму прадмету, у распрацоўцы паасобных момантаў мэтадыкі выкладаньня ў данай ВНУ і па данай галіне, у пра ектаваньні плянаў і праграм для заняткаў асыстэнтаў па тэй ці іншай спэцыяльнасьці і інш. Асаблівай увагі заслугоўва такі від навучальных прац, як складаньне паасобнымі спэцыялістамі дапаможнікаў (сыстэматычных курсаў) на свайму прадмету, у адпаведнасьці з асноўнымі ўстаноўкамі пастановы ЦВК; па некаторых спэцыяльнасьцях у такіх дапаможніках адчуваецца вялікая і бескарыстная патрэба. Нарэшце, яшчэ адна заўвага: **трэба наладзіць па пытаньні рэалізацыі пастановы ЦВК шырокі абмен думкамі навуковых спэцыялістаў у перыядычным друку;** пажадана даць рад артыкулаў, якія-б асьвятлялі данае пытаньне на падставе выкладчыцкага вопыту ў данай галіне навучаньня ў вышэйшай школе.

Сацыялістычнае спаборніцтва—на лепшую рэалізацыю пастановы ЦВК СССР

Калектыў студэнцтва і навуковых работнікаў Віцебскага вэтэрынарнага тэхнікуму прыняў выклік Маскоўскага энэргетычнага інстытуту імя Молатава аб уключэньні ва ўсесаюзнае спаборніцтва ВНУ і ВТНУ на лепшае ажыцьцяўленьне пастановы ЦВК СССР аб вышэйшай школе.

Зараз разгарнулася работа па шырокім абгаварэньні профілю спэцыяліста. Да ўдзелу ў гэтым абгаварэньні студэнты прыцягваюць Чэрыкаўскі сэвінасаўгас «Чырвоны Кастрычнік» і вэтгрупу Калгасцэнтру.

Калектыў інстытуту ўлічае выпрацаваць да 1 сьнежня профіль, вучэбны плян і праграмы для 10-месячных вэтфальчарскіх курсаў.

Наладжана агульны сход калектыву тэхніку му выпрацаваў цэлы рад пунктаў па хутчэйшую рэалізацыю пастановы ЦВК.

Вось некаторыя з іх:

— Выпрацаваць і давесьці да кожнай групы пэрспэктыўны плян гадавой вучобы па ўсіх групах тэхнікуму.

— Выпрацаваць праграмы па спэцыяльных дысцыплінах, прадугледзіўшы ў кожнай праграме, якія разьдзелы дысцыплін прайсьці на практыцы.

— Скласьці праграмы для выездаў на практыку, увесьці для студэнтаў абавязковыя калёквіумы па пройдзеных за час практыкі разьдзелах спэцыяльных дысцыплін.

— Арганізаваць пастаянныя вытворчыя парады, якія дапамагалі-б правядзеньню ўсіх мерапрыемстваў па рэалізацыі пастановы ЦВК.

— Арганізаваць габінэты мікрабіялёгічны і эпізаталёгіі, пашырыўшы таксама абсталяваньне хэмічнай лябараторыі.

Сход вынес цэлы рад падрабязных пунктаў адносна павышэньня якасьці вучобы, дасканалага ўліку пасьпяховасьці кожнага студэнта, павышэньня адказнасьці выкладчыкаў за пасьпяховасьць студэнтаў і інш.

Калектыў тэхнікуму ў сваёй пастанове ўхваліў праводзіць заклік два разы ў год.

Вэтгрупа Калгасцэнтру павінна пайсьці насустрач студэнцтву ў іх патрабаваньні аб перадачы тэхнікуму чэрыкаўскай вэтлячэбніцы, як базы для практычнай прапрацоўкі спэцыяльных дысцыплін.

Наркамзем БССР павінен тэрмінова арганізаваць справу па выданьні падручнікаў для сельска-гаспадарчых тэхнікумаў, у тым ліку і для вэтэрынарнага. Адсутнасьць падручнікаў—вялікі тормаз у справе пасьпяховай рэалізацыі пастановы ЦВК аб вышэйшай школе.

Група студэнтаў.

Напярэдадні Кастрычніцкіх сьвят

Менскія пралетары падводзяць вынікі 15-гадовай барацьбы на фронце сацыялістычнай будоўлі

На канфэрэнцыі рабочых-ударнікаў Менску

Заля клюбу імя Сталіна пераполнена. Сюды сабраліся лепшыя прадстаўнікі менскага пралетарыяту—ударнікі вытворчасьці. Яны прышлі падагуліць вынікі 15-цігадовай упартай работы і барацьбы на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі чырвонай сталіцы БССР—Менску.

На канфэрэнцыі адно пытаньне—15 год Кастрычніцкай рэвалюцыі, нашы дасягненьні і задачы. З дакладам выступіў сакратар гараднога камітэту КП(б)Б тав. **Чарнушэвіч.**

— Рабочая кляса Савецкага саюзу, пад кіраўніцтвам свайго баявога авангарду—камуністычнай партыі, на чале з лепшым ленінцам тав. **Сталіным,** за 15 год дабілася вялізарных перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Узяўшы цьвёрды курс на індустрыялізацыю, партыя цьвёрда і непахісна вядзе краіну па шляху сацыялізму, заваёўваючы перамогу за перамогай.

Правільнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі забясьпечыла бурны ўздым індустрыялізацыі адсталых акраін былой царскай Расіі. **БССР шпаркімі крокамі прасоўваецца наперад, ператвараецца ў перадавую індустрыяльную краіну. Чырвонай сталіцы Менску і іншыя гарады БССР не пазнаць. Вырасьлі карпусы новых гігантаў індустрыі, фабрык і заводаў, карпусы навучальных і бытавых устаноў, жылых дамоў для рабочых.** Усе гэтыя посьпехі—вынік правільнага кіраўніцтва партыі, вынік росту вытворчага энтузіязму рабочай клясы і ўсіх працоўных.

Тав. Чарнушэвіч заклікаў рабочых-ударнікаў яшчэ больш згуртавацца вакол камуністычнай партыі, мабілізавацца на ўдарнае скончэньне пляну 4-га заключнага.

Пасьля дакладу разгарнуліся спрэчкі. На трыбуну адзін за другім зьяўляюцца рабочыя-ударнікі менскіх прадпрыемстваў і рапартуюць канфэрэнцыі аб тых вялізарных посьпехах, якія мае кожнае прадпрыемства ў сваім разьвіцьці, абмеркоўваюць вопытам арганізацыі працы па вытворчасьці, указваюць на недахопы ў рабоце.

Рабочы-ударнік гарбарні «Бальшэвік» тав. Брагілеў рапартуе канфэрэнцыі аб датэрміновым выкананьні дзесяцімесячнай вытворчай праграмы і запэўняе, што плян 4-га заключнага таксама будзе выканан з посьпехам. Ён паведамляе, што ў парадку падрыхтоўкі да 15 гадавіны Кастрычніка на заводзе разгарнулася вялікая масавая работа. 85 проц. рабочых замацаваліся за гарбарняй да канца другой пяцігодкі. 37 лепшых ударнікаў уступілі ў рады ленінскай партыі.

Тав. Вузсон (завод «Камунар») паведаміў канфэрэнцыі аб вялікай цяжэ ў партыю з боку рабочых-ударнікаў заводу. Камунараўцы зьявіліся ініцыятарамі сталінскага закліку лепшых рабочых-ударнікаў у рады ленінскай партыі. **Ён падае прозьвішчы старых рабочых-кадравікоў з 35-40 гадовым вытворчым станжам, якія падалі заявы аб прыёме іх у рады партыі.**

Аб разгортваньні сталінскага заклікі і вялікай цяжэ ў партыю расказвалі і прадстаўнікі заводу **«Полымя рэвалюцыі», імя Варашылава,** фабрыкі **імя Крупскай, «3-га сакавіка», «Камунаркі»** і інш.

Наколькі ўзрос палітычны ўзровень рабочых наглядна паказвае выступленьне рабочага-ўдарніка заводу «Полымя рэвалюцыі» **—тав. Хвасьцякова.**

— Контр-рэвалюцыйная група Руціна—Іванова—Галкіна—кажа ён прапанавала партыі сваю пляцформу—здаць ДнепрадЭС і іншыя нашы гіганты індустрыі ў канцэсію капіталістам. Гэта наглая контр-рэвалюцыя. Партыя правільна наступіла, калі выключыла з сваіх радоў людзей, якія апрача шкоды, краіне нічога ня прынесьлі.

— Мы ніколі не аддамо таго, што завая валі сваімі рукамі. Ад імя 700 рабочых нашага заводу запэўняю партыю, што мы будзем з яшчэ большым энтузіязмам і энэргіяй змагацца за генэральную лінію партыі.

Прамова **тав. Хвасьцякова** была сустрэта бурнай авацыяй усёй залі.

Так адзін за другім, простымі, але зусім яснымі словамі прадстаўнікі менскага пралетарыяту расказвалі аб посьпехах у галіне разьвіцьця кожнага прадпрыемства, аб росьце вытворчага энтузіязму рабочых.

Лепшай ілюстрацыяй дасягненьняў прадпрыемстваў у галіне вырабу тавараў шырокага спажываньня зьяўлялася выстаўка, арганізаваная ў клюбе, дзе адбывалася нарада фэрэнцыя. Усё, што раней выкідалася на вуліцу, звальвалася ў сьмецьцёвыя ямы, зараз ідзе на выраб патрэбных для спажыўца добрых рэчаў. На выстаўцы можна было бачыць сякеры, патэліцы, клямкі, вілкі, завесы, засовы, коўдры, балеткі, табурэткі, шафы,—усё, у чым так востра адчувае патрэбу селянін—калгаснік і аднаасобнік.

Канфэрэнцыю вітаў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гікало які коратка спыніўся на посьпехах Савецкага саюзу і БССР на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, і заклікаў рабочых-ударнікаў прыкладасьці максымум сіл і энэргіі на пасьпяховае скончэньне першай пяцігодкі, на-ўдарнаму пачаць выконваць другую пяцігодку—пяцігодку пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Ф—ў.

ПРАЛЕТАРЫ ВІЦЕБСКУ СУСТРАКАЮЦЬ 15-ГОДЗЬДЗЕ КАСТРЫЧНІКА НОВЫМ УЗДЫМАМ ТВОРЧАГА ЭНТУЗІЯЗМУ

У адзнаку гістарычнай даты **XV-годзьдзя Кастрычніка,** 5 лістапада ў **Віцебску** склікаецца зьлёт лепшых ударнікаў прадпрыемстваў. Фабрыкі і заводы ўдарна рыхтуюцца да зьлёту. Шырока разгарнулася спаборніцтва паміж прадпрыемствамі, цэхамі, брыгадамі і паасобнымі рабочымі на лепшае выкананьне вытворчых заданьняў.

На панчошнай фабрыцы імя **Клары Цэткін** рад ударных брыгад паказваюць прыклад работы. Брыгада **Вяльчынскай** матальнага цэху на аснове зьменна-сустрэчнага плянаваньня штодзённа выконвае сваё заданьне на 125-135 проц. Прыкладам зьяўляецца сама **Вяльчынская,** яна штодзённа дае 18 замест 13 кілёграм пражы.

Брыгадзе **Вяльчынскай** не ўступае брыгада вязальнага цэху **Карэлінай,** якая штодзённа замест 76 дзесяткаў пар панчох выпрацоўвае 85-90, што складае 125 проц. заданьня. Пастаўшы ў цэнтр ўвагі барацьбу за якасьць, брыгада здолела за кароткі час процант браку ад штопкі давесьці да 22-20 проц., замест устаноўленых плянам 35. Кожны тыдзень пасьля работы і ў часе абедзеннага перапынку праводзяцца вытворчыя нарады па якіх падводзіцца вынік мінулай работы і намячаюцца мерапрыемствы для далейшай работы.

На панчошнай фабрыцы **«КІМ»** паміж брыгадамі **Куравенкінай** і **Барановускай** заключан сацдагавор на лепшую падрыхтоўку да зьлёту. На аснове шырока разгорнутага сацспаборніцтва, брыгада **Куравенкінай** — верасьнёўскае заданьне выканала на 145 проц. і за 15 дзён кастрычніка на 131 проц. Выкананьне пляну ў брыгадзе **Барановускай** дасягнула 133 проц. Брыгадамі поўнасьцю зьнішчан брак. Ударнікі-механікі гэтых брыгад **Быкаў** і **Бялінскі** лепш пачалі адносіцца да машын і варштатаў. Яны штодзённа перад пускам машын правяраюць іх станосьвіча. Папераджальны рамонт робіцца ў часе абедзеннага перапынку, што спрыяе канчатковаму зьнішчэньню прастояў. У брыгадах вылучаны спэцыяльныя вучоты, якія даводзяць да брыгад заданьне і іх выкананьне.

Узоры работы паказвае брыгада **Норкінай,** выконваючы вытворчую праграму па 110-115 проц. Канчаткова зьнішчан брак, прагулы і спазьненьні па работу.

Шмат энтузіястаў барацьбы за колькасныя і якасныя паказальнікі ёсьць і на іншых прадпрыемствах гораду. **На шчацінным камбінаце** вылучаецца ўдарная брыгада **Эсхізава.** Штодзённае выкананьне праграмы ў брыгадзе складае 110-115 проц. Шчацінны замест 4.344 кілёграм, яна дае 4.798. Узоры работы паказваюць паасобныя ўдарнікі тав. **Барык, Кароўка, Малыгін,** Эсхізаў, сыстэматычна перавыконваюць заданьні.

Гаворачы аб рабоце ўдарных брыгад разам з гэтым будзе ня лішнім паказаць паасобных герояў ударнікаў-барацьбітоў за пяцігодку ў чатыры гады.

Рабочыя зьмены «Б» піджачнага цэху фабрыкі **«Сьцяг індустрыялізацыі»** тав. **Пазьняковў** сыстэматычна выконвае сваё заданьне больш як на 100 проц., ня мае ні аднаго прагулу і спазьненьня. За 6 год работы на фабрыцы ён ня меў ні аднаго спазьненьня, канчаткова зьнішчыў брак і пераробкі.

Тав. **Галадзіцкі**—токар заводу **«Чырвоны мэталіст»** вядомы на заводзе як лепшы ўдарнік. Сваё заданьне па абточцы падшыпнікаў для бульба-капалак перавыконвае, дае на 40-45 штук замест плянавых 32-х. Расточвае па 18-20 штук муфт для колаў плугу **«Збэргарда»** замест нормы ў 12 штук. Вялікіх цыліндрычных шасьцёрак замест заданьня ў 40 штук дае 55.

Да ліку перадавікоў адносіцца і тав. **Камамячанка,** які працуе на апрацоўцы ступіц бульба-капалкі, заўсёды перавышае сваю норму на 6-8 штук. Тав. **Камамячанка** зьяўляецца брыгадзірам лепшага гаспадарча-разрахунковага варштату № 78.

Героям пяцігодкі на фабрыцы імя **Клары Цэткін** зьяўляецца тав. **Нікіціна.** Яна выпрацоўвае замест 30 дзесяткаў панчох — 48-50 дзесятак. На працягу трох год работы на фабрыцы яна тры разы прэміявана. На прыкладу работы тав. Нікіцінай раўняюцца ўсе астатнія ўдзельнікі брыгады.

На гэтай жа фабрыцы працуе 14 год матальных машынах работніца **Дубраўлянская.** Яна раней ледзь выпускала 20 кілёграм пражы, зараз дае 26 кілёграм. На бабінах норма складае 56 кілёграм. Дубраўлянская-ж выпрацоўвае 60. Прадукцыя Дабраўлянскай высокай якасьці.

Зарубежны, Казанскі, Узьдзін.



Мантаж трансфарматараў падстанцыі заводу фэрасплаваў Днепракамбінату

М. МОДЭЛЬ

НА ЎЗДЫМЕ

(Мастацтва БССР да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі)

Мастацкі вучастак культурнага будаўніцтва БССР прыходзіць да юбілею Кастрычніцкай пралетарскай рэвалюцыі з вялікімі дасягненьнямі, якія зьяўляюцца **вынікам ленінскай нацыянальнай палітыкі КП(б)Б,** ажыцьцяўленай пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Вялізарны росквіт мастацтва ў СССР і БССР, што зьяўляецца заваяваньнем «першай бацькаўшчынай рэвалюцыі» (Ленін), суправаджаецца поўным заняпадам мастацтва ў буржуазнай Эўропе. У гэтай сувязі надзвычай характэрным зьяўляецца весткі з Парыжу, дзе павялічаецца, што 50 тыс. мастакоў Монпарнасу (квартал у Парыжы) «таладаюць у страшэнным сэнсе слова. Карціны вядомых майстроў, за якія яшчэ нядаўна прапануўвалі сотні тысяч франкаў, цяпер можна купіць за грашы. Мастакі дэкваліфікуюцца...»

У 1929 годзе ў тэатрах Нямеччыны працавала 8.700 сталых артыстаў, а ў 1932 годзе гэта колькасьць скарацілася да 4.000.

Тое-ж самае і ў ПАЗШ. Адзначаючы заняпад амэрыканскай буржуазнай драматургіі, амэрыканскі пралетарскі пісьменьнік **Майкл Голд** піша: «Гаварыць аб мастацкай вартасьці гэтага тэатральнага гною ўсёроўна, што гаварыць аб калгасавых вартасьцях пашчуны. «Бяф.-сторы» (гісторыі кахаць) і «містэрыі-сторы» (пятаемныя гісторыі) — вось жанры, якія паказваюць шлях дэкадэнту амэрыканскага тэатру.

Цяжкае матэрыяльна-бытавое становішча пераважнай часткі актораў выклікала раскол у тэатральным саюзе Швэцыі. Большасьць актораў, якія галадаюць, выступілі з патрабаваньнем зьмены аклады асобных «зьвёзд», каб хоць прыку за іх кошт палепшыць удзовень заробкаў сярод актораў.

Гэтыя факты і рад іншых досыць выразна паказваюць, па якім шляху ідзе мастацтва ў капіталістычным свеце. **Гэта шлях поўнага дэкадэнсу, поўнага заняпаду.**

У БССР, як і ва ўсім СССР, мастацтва, перамагаючы труднасьці, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, прайшло шлях бязупыннага росту.

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі, з прычыны нацыянальнага і сацыяльнага ўціску з боку царскіх сатрапаў, ня было тлёкіх магчымасьцяй для разьвіцьця мастацтва, якое адлюстроўвала-б жыцьцё і быт народаў, што насялялі «акраіны» былой Расійскай імпэрыі.

Пры савецкай уладзе бурна пачалі разгортвацца ўсе віды культуры і мастацтва. Пасьля вызваленьня Беларусі ад белапольскіх акупантаў, 14 верасьня 1920 году адбылося адкрыцьцё Беларускага Дзяржаўнага тэатру.

За 12 год тэатральнага будаўніцтва ў БССР мы маем вялізарны рост тэатральнай культуры, нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьместу. БССР зараз мае беларускія дзяржаўныя тэатры — **1-шы, 2-гі і 3-ці, Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР і Дзяржаўны яўрэйскі вандроўны тэатр, Дзяржаўны польскі тэатр імя 11-га ліпеня, беларускі дзяржаўны ТРАМ і шырокую сетку тракаў на перыферыі, тэатр Чырвонай арміі, 1-шы і 2-гі калгасны тэатры і тэатр юнага гледача.**

Вялікі мастацкі рост нашых тэатраў атрымаў адпаведную ацэнку на першай усесаюзнай алімпіядзе. Гаворачы аб БДТ-1, журы алімпіяды адзначыла высокую мастацкую культуру тэатру, пагуляўшы спэцыяльны рэжысуры, акторскага ансамблю, які ўмее выявіць падзеяць сацыяльнае значэньне вобразу, чыстату мовы і мастацкую падачу сцэнічнага слова. Журы канстатавала, што тэатр «падышоў да праблемы нацыянальнага мастацтва ня шляхам паверхоўнага экзатычных тэатраў старажытнасьці, а шляхам вывучэньня рабочае клясы Беларусі сёньняшняга дня».

Журы ўсесаюзнай алімпіяды адзначыла вялікі ідэйна-мастацкі рост БДЯТ, што знайшло сваё выяўленьне ў рашучай устаноўцы тэатру на сацыяльна якасьчаны рэпэртуар, стымуляваньне росту яўрэйскай савецкай драматургіі («Ботвін», «Гірш Лекерт», «Глухі» і інш.). Апрача таго журы падкрэсьліла, што жаяўнасьць тэатру пакінуць ДЯТ'у БССР, зьяўляецца фактам буйнага культурнага і палітычнага значэньня ня толькі для Савецкага саюзу, але і для замежных краін».

Вырасьлі тэатральныя пралетарскія кадры. Тэатральны тэхнікум і фабзавучы пры тэатрах рыхтуюць новых актораў, рэжысэраў з асяродзьдзя рабочай клясы і калгасьнікаў. Тэатральны фронт змагаецца за канкрэтызацыю ў творчай практыцы мэтаду дыялектычнага матэрыялізму. Вырасла нацыянальная савецкая драматургія («Гута» Кобета, **«Ботвін»** Вэнюрка, **«Гірш Лекерт»** Кушнярова, **«Напэр»** Аляксандровіча», **«Мост»** Рамановіча, **«Башкаўчыкі»** Чорнага, п'есы **Ул. Гурскага, Коласа, Сташэўскага, Ільлінскага, Арокаса і г. д.**

Тэатры БССР паказалі ўзоры крытычнага скарыстаньня клясычнай спадчыны — **«Авечая крыніца»** — у БДЯТ, **«Жакерыя»** — у ЯДВТ у пастаноўцы **Л. Літвінава.**

Рабочая кляса і працоўныя БССР маюць значныя дасягненьні і па фронце **музычнага мастацтва.** Музычны тэхнікум і рабочыя музычныя школы выпусьцілі сотні новых музыкантаў, вакалістаў, выкладчыкаў. Вырасьлі нацыянальныя кампазытарскія кадры, творы якіх выконваюцца ва ўсіх саюзных рэспубліках. Сюды адносяцца такія майстры, як **Туранкоў, Цікоцкі, Аладаў,** маладыя кампазытары **Іваноў, Палонскі, Любан** і інш. Творы гэтых кампазытараў як у галіне гармэнічнай дэмакратычных элементаў фальклёру, так і ў шуканьні новых твораў (сымфонія **«8-га сакавіка»** Аладава, музычная сатыра **«Кухня сьвятасьці»** і сымфонія «Вызваленьне Беларусі» Цікоцкага) маюць значны мастацкі ўзровень.

Буйнейшай перамогай у галіне сацыяльна-культурнага будаўніцтва ў БССР зьяўляецца работа студыі оперы і балету, якая згодна пастановы сакавіцкага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б з 1933 году разгортваецца ў самастойны дзяржаўны тэатр музычнай драмы.

З пэўнымі дасягненьнямі да пятнаццацігодзьдзя Кастрычніка прыходзіць і наша эстрада. Сюды трэба адносьці работу **беларускага ансамблю народных інструментаў пад кіраўніцтвам Жыдовіча, яўрэйскай дзяржаўнай капэлы і інш.** Але разам з тым трэба сказаць, што гэты вучастак мастацкага фронту зьяўляецца найбольш **АДСТАЛЫМ.** Беларуская эстрада яшчэ толькі пачынае стварацца. Значная доля віны ў недахопах беларускай эстрады падае на БелДАМЭД, які азмаль нічога не зрабіў для стварэньня беларускага эстраднага мастацтва.

Чацьвертая ўсебеларуская выстаўка **выяўленчага мастацтва** прадэманстравала рост савецкіх мастакоў. Тэматыка сацыялістычнага будаўніцтва — асноўны стрыжань у працы разьбяроў і мастакоў на выстаўцы. Характэрным у гэтых адносінах зьяўляюцца такія працы, як «Рулі проч ад СССР» — Грубэ, «Торфаразпрацоўні» і «На сахарным заводзе» — Ахромчыка, «Кузьня» — Заборава, працы Гаўрылейкі на калгасныя тэмы і інш. Падрыхтоўка да пятай мастацкай выстаўкі, прысьвечанай пятнаццацігодзьдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі, сьведчыць аб далейшым ідэйна-мастацкім росьце разьбяроў і мастакоў БССР.

Беларуская **савецкая кінематаграфія** — найбольш маладая з мастацкіх арганізацый БССР — таму яе ідэйна-мастацкі рост асабліва яркі. Пачаўшы ў 1924 годзе з карціны «Лясная быль», па аповесьці **Міхася Чарота,** беларуская кінематаграфія вырасла ў буйную арганізацыю. Такія фільмы, як «Нянавісьць», «Рубіжэ», новыя гуказныя фільмы «Слава сьвету», «Знамя Бэкера», «Заходні фронт, «Баём насустрач» — зьяўляюцца фільмамі агульна-саюзнага значэньня і ставяць кіно-фабрыку Беларусі на адно з першых месц у сыстэме Саюзкіно.

Кіно-фабрыка выхавала і выхоўвае кадры здольных рэжысэраў і спэцыялістаў — Кобец, Вольны, Губаровіч, Брадзінскі, Тарыч, Корш, Файнцымэр і інш. У 1932 годзе фабрыка выпусьціла першы гукавы поўнамэтражны фільм па беларускай мове **«Баём насустрач».**

Аднак, кіно-фабрыка **значна адстае ў галіне падрыхтоўкі беларускіх кіно-кадраў,** у справе беларусізацыі, экранізацыі твораў беларускіх пісьменьнікаў. Фабрыка яшчэ невыстарчальна ўключылася ў барацьбу за тэматыку сацыялістычнага будаўніцтва БССР.

Самадзейны мастацкі рух ахапіў шырокія колы рабочых і калгасьнікаў. Паводле пяцёўных вестак у 1931 годзе ў самадзейных гуртках, агітпрабрыгадах, жывым тэатралізаваных газэты было ўдзігнута каля **30 тыс. чал.** Самадзейнае мастацтва стала сапраўднай крыніцай паваўненьня творчымі пралетарскімі кадрамі радоў прафэсыянальнага мастацтва.

Вялікае значэньне ў галіне ўзмацненьня барацьбы за марксыцка-ленінскую мэтадалёгію ў мастацтве і мастацтвазнаўстве мае работа інстытуту Літаратуры і Мастацтва Беларускай Акадэміі Навук. Новая тэарэтычная часопісь **«Мастацтва і рэвалюцыя»** канцэнтрыце вакол сябе шырокія кадры работнікаў мастацтва.

Дасягненьні ў галіне будаўніцтва беларускага савецкага мастацтва і мастацтва іншых нацыянальнасьцяй у БССР, зьяўляецца вынікам плённага кіраўніцтва ленінскай нацыянальнай палітыкі нашай партыі. Гэтыя дасягненьні атрыманы ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. У выніку барацьбы па два фронты разгромлен беларускі контррэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм, які меў моцныя ўплывы на нашым мастацкім фронце. Панесены руйнуючы ўдар вялікадзяржаўнаму шавінізму—галоўнай небясьпецы на даным этапе, які адмаўляў і адмаўляе магчымасьць разьвіцьця нацыянальнага пралетарскага мастацтва.

Пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый стымулявалі вялікі ўсплыск мастацкай творчасьці, дапамагчі больш глыбокаму павароту мастацка-савецкіх кадраў да актуальных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Далейшая напружаная работа па рэалізацыі гістарычных пастаноў партыі ўзьніме дзейнасьць мастацкіх устаноў на яшчэ больш высокую ступень. Арганізацыя саюзаў савецкіх мастакоў, разьбяроў, кампазытараў і інш. значна паскорыць перабудову мастацкіх арганізацый.

Другая пяцігодка разьвіцьця мастацтва ў БССР прадугледжвае вялізарны колькасны і якасны рост мастацкай сеткі. Таксама прадугледжваецца адкрыцьцё новых навучальных устаноў (музычны ВНУ, тэатральны ВНУ і інстытут выяўленчага мастацтва) якія будуць рыхтаваць высокакваліфікаваныя мастацкія кадры.

Узьняцьце якасьці работы ўсіх вучастка нашага мастацкага фронту на ўзровень патрабаваньняў эпохі—зьяўляецца важнейшымі задачамі савецкага мастацтва ў 2-гой пяцігодцы.

«Тэатр нашай эпохі павінен перакопваць і натхнёна, ганьбіць і асьмейваць, зараджаць балёрым сьмехам перамогі і падзесцяраць сілы мілёнаў зкрыстым вясельлем... тэатр павінен умець не закопвацца ў дробязях хоць-бы і баявога жыцьця нашага дня, ня быць капіравальчыкам і толькі шчырым рэгістратарам бягучых фактаў, не адрываючыся ні на секунду ад тэтых «прыбяжэй», жывучы жыцьцём «ўнешняга момаванту, зьліваючыся з яго баявым струменем, узьніманца на вышыню вялікіх мастацкіх абагульненьняў, якія паглыбляюць разумоньне жыцьця і яго зьяў, пазбягаючы ім растаяваць і тым самым дапамагаюць ачлавечаньню і кіраўніцтву вялікім будаўніцтвам сацыялізму».

Гэта выказваньне тав. **Бубнова** цалкам адносіцца да задач усіх галін мастацтва на новым этапе.

Вырасьцім колькасна і якасна мастацкіх кадры БССР, пад кіраўніцтвам партыі, прадвяжнае пролетарскай грамадзянасьці, забяспечань перабудову мастацкага фронту і адпаве ісьці з задачамі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, рэалізуючы пастанову партыі аб стварэньні мастацкіх устаноў мастацтва.

Дэфэнзыва і... „язда на цягнікох“

ВІЛЬНЯ, 26 (Уласн. інфарм.). Днём і ноччу працуе машына фашысцкага тэрору. Польскі фашызм са страхам бачыць, як нарастае магутны шквал рэвалюцыйнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы працоўных мас. Лавіна стачак коціцца па ўсёй краіне. Абшары акупаваных ЗБ і ЗУ ахопілены агнём паўстаньняў. Палаюць панскія маёнткі. Усё больш частымі робяцца партызанскія выступленьні. З трывогай і пенакоем фашысцкая прэса крычыць аб «грозным радыкалізацыі вёскі», аб «нарастаючым мацнейшым гурагане».

Фашысцкая рэакцыя кідаецца ва ўсе бакі, як шалёны на тінучым судне. Ваенна-палявыя суды зьбіраюць свой крывавы ўраджай ужо ня толькі ў такіх буйных прамысловых цэнтрах, як Варшава, Вільня, Кракаў, Горадня і інш. Сьмяротныя і катаржныя прыгаворы закрапулі ўжо і самыя глухія правінцыяльныя куткі фашысцкай Польшчы, як напрыклад, Пінск, Сьвянцяны, Слонім. У вёсках Заходняй Беларусі і Зах. Украіны лютуюць дзесяткі новых карных экспэдыцый узброеных танкамі, самалётамі і бранявікамі. Уся краіна, як павіцінным апутана шпіёнскай сеткай. Гарады і вёскі, станцыі, трамваі, аўтобусы кішаць агентамі дэфэнзывы.

Але і гэтага фашысцкай рэакцыі мала. Вулкан, які нагадвае сабой сучасная Польшча, патражае выбухам. Дэфэнзыва з падвоенай энэргіяй майструе ўсё новыя і новыя спосабы і меры расправы над рэвалюцыйным рухам. Зусім нядаўна быў выдан дэкрэт аб крымінальнай адказнасьці бацькоў за паводзіны іх дзяцей. Даволі, скажам, сыну чым небудзь правініць сваю «непадзейнасьць», каб разам з ім у турму быў пасаджан і яго бацька.

Аднак, і гэты нячуваны крок бляднее перад новым, выключным па сваім зьмесьце дэкрэце аб «паляшэньні ўмоў язды на цягнікох». Гэта бяскрыўдная шыльда захоўвае за сабой набывалую яшчэ ў гісторыі ўсіх ахранак паліцэйскую правакацыю. «Паленшаныя ўмовы» ў фашысцкай рэдакцыі азначаюць пагалоўны «карантын» для ўсіх чыгуначных пасажыраў. Ніхто цяпер у Польшчы ня можа, купіўшы білет, трапіць у вагон без папярэдняй праверкі перад агентам дэфэнзывы. Звычайна пасажыр атрымаўшы білет ішоў на вакзал і садзіўся ў адпаведны вагон. Згодна новаму распараджэньню зараз на ўсіх вакзалах і станцыях уведзены «паленшаныя ўмовы для пасажыраў». Цяпер у фашысцкай Польшчы пасадка ў вагон праводзіцца наступным чынам:

Перад пачаткам пасадкі дзьверы ва ўсіх вагонах закрываюцца на замок. Адкрытымі пакідаюцца толькі дзьверы ў адным крайнім вагоне, праз якія і павінны праходзіць усе без выключэньня пасажыры. Пры дзьвярох стаяць кантралёры, зразумела разам з агентамі дэфэнзывы. Кантралёры правяраюць ня столькі білеты, колькі **асабістыя дакументы кожнага пасажыра, а часта і ўвесь багаж.** Дакументы правяраюцца з асаблівым стараньнем—ад нячаткі, да апошняй літары.

Фашысцкая прэса камэнтуе новы дэкрэт у тумачных і агульных фразах. Віленскія газэты з асаблівай энэргіяй пашыраюць цынічную вэрсію аб тым «паляшэньні», якое даюць «новыя ўмовы язды на цягнікох».

Не ад добрага жыцьця прыходзіцца польскаму фашызму пускацца на падобную махінацыю. Відаць, не салодка прыходзіцца фашысцкай дыктатуры, калі яна прымушана ўводзіць па ўсёй краіне фактычны стан аблогі. Жандары міжнароднай рэакцыі—польскія фашысты пралічацца. Правакацыя з «паляшэньнем умоў язды на цягнікох» выкрыта. Працоўныя масы добра разумеюць, што азначае «паляшэньне ўмоў» па-фашысцку і супроць каго яно накіравана.

Польскі фашызм можа ганарыцца. Па цынізьме сваіх правакацый, па мэтадах і спосабах свайго тэрору ён далёка абагнаў усе ахранкі сусьветнай контр-рэвалюцыі!..

С.

ПЛЯН ЗАХОПУ КІТАЮ

ВІЛЬНЯ, 27. Польская буржуазная прэса ажыўлена камэнтуе паведамленьні з Токіё аб плянах пашырэньня Манчжурыі. Прэса заяўляе, што ў Токіё ўзмоцнена папулярызуецца вэрсія аб «намерах паўночна-кітайскіх правінцый далучыцца да новай Манчжурскай дзяржавы».

Польская прэса, як вядома добра праінфармаваная аб імпэрыялістычных махінацыях на Далёкім Усходзе, паведамляе, што ў сувязі з гэтым у Токіё прыехалі выдатныя манчжурскія і кітайскія палітыкі, варожа настроеныя да нанкінскага ўраду. Неафіцыяльна пашыраюцца весткі, што ў сувязі з «намерамі паўночна-кітайскіх правінцый далучыцца да новай Манчжурскай дзяржавы», «Пу-І будзе зроблен усекітайскім імпэратарам.

ЧАРГОВАЯ АТАКА НА ЗАРПЛАТУ

ВАРШАВА, 25. (Уласн. інфарм.). Варшаўскі магістрат абвясьціў аб усеагульным скарачэньні зарплаты на камунальных прадпрыемствах сталіцы. Зарплата зьніжаецца ўсім рабочым, занятым на камунальных прадпрыемствах Варшавы (электрастанцыя, водаправод, трамваі, хлебазаводы і г. д.). У сярэднім зарплата скарачаецца на 7—10 проц.

Сацыял-фашысцкі «Роботнік» паведамляе, што асабліва вялікае зьніжэньне зарплаты будзе праведзена сярод варшаўскіх трамвайшчыкаў. «Роботнік» паведамляе таксама аб вялікім **абурэньні рабочых мас,** выкліканым новым зьніжэньнем зарплаты.

ПАД'ЁМНЫЯ КРАНЫ НА ЛЕВЫМ КРАІ ДНЯПРОЎСКАЙ ПЛАЦІНЫ

КАНЦЭРТ К. Н. ІГУМНАГА

Дом вучоных БССР сумесна з усебеларускім камітэтам радыёвяшчаньня арганізуе рад вялікіх сымфанічных камэрных і сольных канцэртаў.

29 кастрычніка ў клюбе імя Сталіна (клюб Харчавікоў) адбудзецца канцэрт сусьветна-вядомага вялікага піяніста К. Н. ІГУМНАГА.

К. Н. Ігумнаў зьяўляецца прафэсарам маскоўскай кансэрваторыі. За час сваёй шматгадовай пэдагагічнай працы, К. Н. Ігумны выхаваў цэлы рад піяністаў-віртуозаў, якія на сусьветных конкурсах атрымліваюць першыя месцы. Прыезд К. Н. Ігумнага дае магчымасьць працоўным гораду Менску азнаёміцца з мастацтвам аднаго з маёстраў вялікага выканаўства папшых клясычных твораў са спадчыны мінулага.

Ін. Гіттарц.

ЯКІХ ЗАВОДАЎ БССР БУДЗЕ НАПІСАНА ГІСТОРЫЯ

Ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб напісаньні гісторыі заводаў, як паказ гістарычнай практыкі барацьбы пралетарыяту за сваю дыктатуру, паказ практыкі яго перамогі і пераможнага будаўніцтва сацыялізму мае вялікае палітычнае значэньне.

Асабліва вялікае значэньне будзе мець ГІСТОРЫЯ ЗАВОДАЎ БССР, як нацыянальнай рэспублікі, дзе шпарка разгортваецца індустрыялізацыя і ў сувязі з гэтым адбываецца магутны рост рабочае клясы.

Аднак, да гэтага часу работа па напісаньні гісторыі заводаў БССР праходзіць зусім нездавальняюча. З боку прафсаюзных, а таксама адпаведных навуковых (інстытут гісторыі, БАН) і грамадзкіх арганізацый ня зьвернута належнай увагі на разгортваньне гэтай важнай работы.

Гэтымі днямі прэзыдыум ЦСПСБ вызначыў наступныя прадпрыемствы для напісаньня гісторыі.

У МЕНСКУ—ЗАВОД ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, завод «БАЛЬШАВІК», фабрыка «КАСТРЫЧНІК» гута «ПРАЛЕТАРЫ»; У ВІЦЕБСКУ — фэка «ПРАФІНТЭРН», ПАНЧОШНА-ТРЫКАТАЖНАЯ ФАБРЫКА, фабрыка «ДЗЬВІНА»; У ГОМЕЛІ—ГОМСЕЛЬМАШ, завод ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА, фэбрыка «ГЕРОЙ ПРАЦЫ» (Добруш), «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА» (Новы-Барысаў), ШАЎКОВАЯ ФАБРЫКА (Магілёў), ЦЭМЭНТНЫ ЗАВОД (Крычаў), АСІНАЎСКАЯ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ ІМЯ ТАВ. СТАЛІНА і «ДУБРОВЕНСКАЯ МАНУФАКТУРА».

Прапанавана фабзаўкомам гэтых прадпрыемстваў і гарадзкім райпрафсаюзам адпаведных раёнаў разгарнуць шырокую растлумачальную работу, абгаварыць пытаньні напісаньня гісторыі на сходах рабочых, у цэхах, брыгадах, забясьпечыць шырокі ўдзел рабочых-ударнікаў ва ўсёй гэтай работе.

Таксама прапанавана на гэтых прадпрыемствах зараз-жа склясьці рэдакцыйныя калегіі, якія павінны прыступіць да практычнай работы па напісаньні гісторыі свайго заводу.

Зубныя пратэзы з храмаваных мэталяў

Два гады таму назад, у Стаматалёгічным інстытуце Ленінграда, па ініцыятыве загадчыка пратэзнага аддзяленьня гэтага інстытуту доктара Бярковіча пачалася навуковадасьледчая праца, мэта якой была замена золата для каронак і штучных зубоў таннымі мэталямі — медзьдзю і срэбрам.

З прычыны таго, што медзь і срэбра акісьляюцца ў роце, доктар Бярковіч прапанаваў накрываць пратэзы, прыгатаваным з гэтых мэталяў хромам. Дасьледваньні, якія праводзіліся ў лябараторыі ленінградзкага стаматалёгічнага інстытуту на працягу 1½ год пры ўдзеле буйных спэцыялістаў-бжыцэраў, біохэмікаў, фармакалёгаў, а таксама буйных спэцыялістаў усесаюзнага інстытуту мэталяў, далі падзвычай каштоўныя вынікі: былі знойдзены спосабы храмаваньня ня толькі мэдных пратэзаў, але і срэбраных.

Хром, які пластоўваецца на паверхню каронак, або зубоў тонкім пластом па спосабу электралізу, вельмі цьвёрды, доўга працістаіць сьціраньню, не акісьляецца ў роце і ня ўплывае шкодна на арганізм чалавека.

Хром зьяўляецца вельмі пекным па сваім колеры мэталям і цалкам замяняе золата. 6-8 месяцаў таму назад ленінградзкі інстытут перайшоў на масавы выраб рабочым ленінградзкіх заводаў храмавых каронак і пратэзаў.

На ўсебеларускай адаптацыёнай нарадзе, якая адбылася ў жніўні месяцы па пытаньнях 2 пяцігодкі, быў заслуханы даклад аб новым спосабе храмаваньня пратэзаў. Тады-ж была прынята пастанова арганізаваць у Менску першую лябараторыю па выробе храмаваных пратэзаў. Але-ж з прычыны таго, што ў жніўні г. г. прадбачыўся ўсеўкраінскі зьезд стаматалёгаў, на якім павінна было стаяць пытаньне аб храмаваньні, мы лічым неабходным пачакаць з практычным ажыцьцяўленьнем гэтага пытаньня, пакуль зьезд ня скажа свайго аўтарытэтнага слова з пораду храмаваньня.

На зьезьдзе, на якім прымалі ўдзел беларускія спэцыялісты, пытаньне храмаваньня было абгаворана ўсебакова і была ўхвалена рэзалюцыя аб шырокім ужываньні храмаваных пратэзаў.

Зараз аданталёгічным інстытутам прыступлена ўжо да арганізацыі ў г. Менску пры цэнтральнай рабочай паліклініцы цэнтралізаванай лябараторыі і з гэтай мэтай у бліжэйшыя дні выяжджаюць у Ленінград 2 таварыша для дэталянага азнаямленьня з мэтодыкай храмаваньня і для набыцьця спэцыяльнага абсталяваньня.

Пратэзы з храмаваных мэталяў даюць нам магчымасьць шырока разгарнуць масавае абслугоўваньне рабочых пратэзнай дапамогай, даючы нам магчымасьць зусім адмовіцца ад золата.

Дырэктар Аданталёгічн. Інстытуту Дацэнт — МЭТЛІНСКІ.

ЗА АДНО СЛОВА —ШТРАФ...

ВІЛЬНЯ, 25. (Уласн. інфарм.). Намі атрыманы весткі з Заходняй Беларусі аб штрафаваньні беларускіх школьнікаў за кожнае сказанае імі беларускае слова. З вёскі Лазьнікі (ў 10 клм. ад Вільні) нам паведамляюць:

«Нашы дзеці, як вядома, гутараць у школе паміж сабой па-беларуску. Не падабаецца гэта польскім настаўнікам. Зараз нашым дзецям загадалі гаварыць паміж сабой толькі па-польску. Калі слоўны загад не дапамог, дзяцей пачалі караць штрафамі: па 5 грошай за кожнае сказанае па беларуску слова. Гэта ня жарт, а факт. Селянін Т. ужо заплаціў за сына такі штраф».

* * *

Акупанты ня спыняюцца ні перад чым у сваіх мэтах паскораных палёнізацыі і фашызацыі Заходняй Беларусі і Зах. Украіны. Польскі фашызм разграміў усе да аднэй беларускія культурна-асьветныя арганізацыі і ўстановы. Беларускае школьніцтва, літаральна, задушана. Беларускім працоўным масам ня толькі не дазваляецца мець свае школы. Акупанты забараняюць нават навучаньне дзяцей на беларускай мове прыватным парадкам. Сваёй палітыкай палёнізацыі і фашызацыі акупаваных ЗБ і ЗУ польскі фашызм імкнецца падрыхтаваць сабе зручны плацдарм для ажыцьцяўленьня сваіх інтэрвэнцыяністкіх плянаў.

Зараз беларускіх дзяцей пачынаюць нават штрафаваць толькі за адно слова, сказанае імі на іх роднай мове. Такая яна «культура і цывілізацыя» па-фашысцку!..

МАГУТНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ БЕСПРАЦОЎНЫХ

ВАРШАВА, 26. (Уласная інфармацыя). Буржуазная прэса траціць шмат энэргіі на прапаганду так званых «публічных работ» (прымусовыя работы для беспрацоўных). Фашысцкія борзапісцы, зразумела, стараннa ўтойваюць бязьмежную экспляатацыю і катаржныя ўмовы працы, якія пануюць на гэтых «публічных работах».

За жабрацкую зарплату, якой лезь хапае на кавалак хлеба, беспрацоўных прымушаюць выконваць самыя цяжкія работы. Але і гэта яшчэ ня ўсё. Беспрацоўных, пасланых на «публічныя работы», ашукваюць самым агідным чынам. Магістраты адбіраюць у іх нават і тыя грошы, якія ім належаць за работу.

На ўсёй краіне адбываюцца масавыя выступленьні беспрацоўных супроць «публічных работ». Гэтымі днямі такое выступленьне мела месца ў Чэнстахове. Больш 1.000 беспрацоўных—дэманстравалі перад будынкам магістрату, які нядаўна правёў скарачэньне платы на «публічных работах» у разьмеры 25 проц. Сотні дэманстрантаў, ня гледзячы на паліцэйскі тэрор, шпарта не адыходзілі ад магістрату, патрабуючы звароту грошай. Ніякага адказу яны не атрымалі. Кіраўнікі магістрату выклікалі паліцэйскія падмацаваньні, якія сілай зброі разагналі тысячную дэманстрацыю беспрацоўных. Масы гарадзкіх рабочых і беспрацоўных узбуджаны.

БАНКРУЦТВА ЮГАСЛАВІІ

ПАРЫЖ. «Авэнір» зьмясьціла артыкул, у якім у сумных фарбах малюе фінансавае становішча Югаславіі.

«Югаслаўскі ўрад,—піша газэта,—паведаміў, што «з прычыны труднасьцяй транспарту ён ня зможа ўплаціць 15 кастрычніка чарговага ўзносу па дзьвёх даваенных пазыках». «Авэнір» указвае, што югаслаўская дзяржава, якая палічвае 13 млн. жыхароў, мае 32 млрд. дынараў замежнага дзяржаўнага доўгу і 6 млрд. унутранога доўгу. Штогодныя плацяжы па замежных даўгох Югаславіі складаюць каля 1.200 млн. дынараў.

«Калі раней,—піша «Авэнір»—гэты доўг пакрываўся на ⅔ за кошт германскіх рэпарацый і часткова за кошт мытных паступленьняў, то зараз усё гэта адпадае.

Даход ад мытных паступленьняў і ад турыстаў скараціўся ў вялізарнай ступені, але асноўны ўдар нанесен Югаславіі маратoрыем Гувера, які вырваў у яе з бюджэту 800 млн. дынараў». «У сувязі з гэтым,—заяўляе далей газэта,—пасьля заключэньня лёзанскай згоды дзяржавы-крэдыторы вымушаны былі адтэрмінаваць Югаславіі ўплату 150 млн. дынараў па ваенных даўгох. Французкі ўрад, апрача таго, даў згоду на адтэрмінёўку на адзін год уплаты 180 млн. франкаў па міжурадавых даўгох. Таксама была адтэрмінавана ўплата па пазыцы ў 100 млн. франкаў, прадастаўленай французкімі банкамі югаслаўскай дзяржаўнай табачнай манаполіі».

Артыкул «Авэнір» заканчваецца рэзкім выпадам супроць «галоўнага вінаватага фінансавага банкрутства Югаславіі—ПАЗІЧ».

КАТАРЖНЫЯ ПРЫГАВОРЫ У РЫЗЕ

РЫГА. (ТАСС). Рыскі акруговы суд вынес прыгавор па справе 11 асоб, абвінавачаных у прыналежнасьці да кампартыі. Падсудны Артур Юян і Павал Коціп прыгаворены да 4 і 6 год катаржных работ. Густаў Грынбэрг — да 4-х год катаргі. Астатнія падсудныя прыгавораны да зьняволеньня ў крэпасьці ад 2-х да 4-х год кожны.

Дзеньнік савецкай навукі

ЦБ сэкцыі навуковых работнікаў для большай рэалізацыі пастановы ЦВК СССР ад 19 верасьня бягучага году парашыла разам з ДВС склікаць некалькі нарад па пытаньні аб МЭТАДАХ ЗАНЯТКАЎ У ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ. Нарады будуць адбывацца па асобных групах дысцыплін.

31 КАСТРЫЧНІКА АДБУДУЦЦА ўсебеларускія нарады па групах: МАТЭМАТЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН, ФІЗЫКА-ТЭХНІЧНЫХ, МЭДЫЧНЫХ САЦЫЯЛЬНА . ЭКАНАМІЧНЫХ, ПЭДОЛЁГА-ПЭДАГАГІЧНЫХ І ПРЫРОДАЗНАЎЧЫХ.

18 ЛІСТАПАДА будзе нарада па хэмічных навуках.

У ГОРКАХ адбылося вызначэньне пасяджэньня ЦБ СНР БССР па пытаньнях працы гарацкіх ВНУ і горацкай сэкцыі навуковых працаўнікоў.

Паведамленьне

— 28 кастрычніка, у 6 гадз. вен., у Мінгаркоме КП(б)Б, пакой № 24, адбудзецца нарада таварышоў, вылучаных гаркомам для правядзеньня генар. праверкі выканаўцаў ня пастаноў сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б аб культбудаўніцтве. На нараду павінны зьявіцца наступныя т. т.: Джэлюк, Самуцін, Воінаў («Зьвязда»), Жарскі («Орка»), Віткоўскі, Кукелка, Матвеенка, Рымашэўскі (БАН), Чэрняк, Пузікаў («Рабселькор»), Клыс, Гольмшток (ЦВК), Рэйзецкі (Камвуз), Галавэда (Сабвуд), Брытаў (НДІ с.-г.), Васільлеў (НДІ прамысл.), Катан (курсы п-актыву), Месроўіч (ВКУ), Новадворац (Яўнэдтэхнікум), Кіган (ВНІ), Калінёўскі (Польтэдтэхнікум), Ратнэр, Аксенцоў, Вількоў (Хэм.-тэхн. ін-т), Бэр, Кабакоў («Акцябр»), Эфрон (АЗЕТ), Левіган (Камзет), Чарнабродаў (НКА), Бронштэйн, Кацовіч (БАН), Пакроўскі (БДТ 1), Алтман, Дубравіцкі (БДВ).

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

Дзяржаўнага Вучонага Савету Наркамасьветы БССР.

Дзяржаўны Вучоны Савет прапануе дырэктарам усіх вышэйшых навучальных устаноў і навукова-дасьледчых устаноў БССР прадставіць сьпісы асоб, якія занялі ў гэтых установах пасады прафэсароў, вучоных спэцыялістаў, дацэнтаў і старшых навуковых супрацоўнікаў, пачынаючы з 1-га ліпеня 1930 г.

У сьпісах павінны быць паказаны: фамілія і імя працаўніка; займаемая пасада. Кім і калі прызначан. Кім і калі зацьверджан у гэтай пасадзе. Пералік навуковых прац.

Сьпісы павінны быць падраваны да 5-га лістапада г. г. у 2-х экз. па адрасе: Менск, пляц Волі, НКА Кваліфікацыйная камісія ДВС.

Нам. Наркома Асьветы БССР старшыня Дзяржаўнага Вучонага Савету **Вальфсон.**

Вучоны сакратар ДВС **Чмялёўскі.**

БЯГЛЕЦ

„Чырв. Зорка“ Пач.: 6, 7, 30, 9, 10-30 Каса ад 1 г. дня — Гукавы гаварашчы фільм **СПРАВЫ І ЛЮДЗІ**

Інтэрнацыянал — БЕЛЫ АРОЛ. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ Кіно-хроніка Саюзкіно

Пралетары — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **ЭЛІСО** Дзіцячыя дзіцячыя сеансы **КІМ ДЗЯЖУРНЫ**

„СПАРТАК“ Пач.: 7,8-10,9-20, 10-40. Каса—з 5 г. — Выдатны фільм **ПРАСТЫТУТКА** Драма ў 7 частках.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на аднагадовыя вячэрнія **КУРСЫ** мэдычных сясьцёр і сясьцёр-гаспадынь (дыэтычак) працягнут да 6 лістапада

Заявы прымаюцца штодзенна з 1 гадз. дня да 5 гадз. вечара, у памяшканьні гар. камітэту Чырвонага Крыжу— Першамайская вул. д. № 7.

На дапамогу бедным вучням! **ВЕЧАР-ЗЬЛЁТ** ініцыіву пачэк т-ва „Прыхільнік Дзяцей“ гор. Менску.

адбудзецца 30 кастрычніка, у 7 з пал. гадз. веч., у памяшканьні клюбу харчавікоў імя Сталіна (рог Інтэрнацыянальнай і Камсамольскай)

— Даклад на тэму: —

„Што даў Кастрычнік дзецям“.

Пасьля—мастацкая частка. Арыестр духавой музыкі, буфэт і лётарэя.

Білеты па ячэйках 1—на „Прыхільнік Дзяцей“ і ў праўленьні т-ва (Савецкая, 40) да 30 кастрычніка з 10 да 4 гадз.

Праўленьне ОДД.

БЕЛАРУСКІ Дзяржаўны Будаўнічы Інстытут АПАВЯШЧАЕ СТУДЭНТАЎ, прынятых на вячэрнія аддзяленьні Ін-ту па асеньнім наборы 1932 г., што заняткі вячэрніх груп першага курсу Інстытуту пачнуцца 1 лістапада г. г. у 6 гадзін вечара ў старым памяшканьні Інстытуту: рог Універсытэцкай і Чырвонаармейскай 42-8.

Яўка ўсіх прынятых студэнтаў абавязкова.

Дырэкцыя Інстытуту.

ПАСТАНОВА МЕНСКАГА ГАРСНАБУ

ад 27 кастрычніка 1932 году.

1. Абавязаць усе каапэрацыйныя і дзяржаўныя гандлёвыя арганізацыі гораду Менску і раёну правадзіць гандель на ўсіх крамах, пачынаючы з 28-га кастрычніка па 6 лістапада г. г. уключна да 12 гадзін ночы.

2. 7 і 8 лістапада хлебныя і гародна-фруктовыя крамы, ларкі і кіёскі працуюць у звычайным парадку, з астатніх прадуктовых і прамтаварных крам каапэратыўных і дзяржаўных арганізацыям вылучыць дзяжурныя краны, якія працуюць у звычайным парадку.

3. 7 і 8 лістапада па вуліцах гораду рабкоопамі адкрываюцца ларкі, столікі і палаткі, згодна дасланага плану.

Сталоўкі і буфэты 7 і 8 лістапада працуюць у звычайным парадку.

Базары 7 і 8 лістапада не працуюць.

Менскі гарадзкі інспэктар снабжэньня **Гентман.**

Дзяржаўны вучоны савет і цэнтральнае бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў БССР склікаюць на 31 кастрычніка **НАРАДЫ** па пытаньні аб мэтадах выкладаньня па наступных дысцыплінах

а) Па матэматыцы—адказны т. Сагаловіч.
б) Па біялёгіі „ т. Гусева.
в) Па фізыцы „ т. Усьпенскі.
г) Па хаміі „ т. Гінельфарб.
д) Па сац. гісторычн. „ т. Мэтлін.
е) Па мэдыцыне „ т. Чэрвякоў.
ж) Па літарат. мовазн. „ т. Пістухоўіч.
з) Па падаляга-педаг. „ т. Панкевіч.

Усе нарады адбудуцца ў прыродазнаўчым корпусе (Універсытэцкі гарадок).

На нарады павінны зьявіцца ўсе выкладчыкі ВНУ паказаных дысцыплін г. Менску, а таксама прадстаўнікі Гомелю, Горак, Магілёва і Віцебску.

Нарады адкрываюцца роўна ў 10 гадзін раніцы агульным уводным пасяджэньнем у 301 аўдыторыі прыродазнаўчага корпусу.

Яўка без спазьненьня.

СТАРШЫНЯ ДВС **ВАЛЬФСОН.**
СТАРШЫНЯ ЦБ СНР БССР **РЫЎЛІН.**

29-X—32 г. у 7 гадз. вечара, у памяшканьні Менгарсавету (вялікая заля) адбудзецца **зьлёт дэпутатаў і сэкцыянэраў гарсавету.**

Яўка абавязкова.

Менгарсавет.

Абавязковая пастанова № 71

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

27 кастрычніка 1932 г. г. Менск

Аб парадку сьвяткаваньня XV годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць кіраўнікоў дзяржаўных, грамадзкіх, прафэсыянальных і каапэрацыйных устаноў і арганізацый, а таксама жаны і ўладароў домаўладаньняў упрыгожыць на прапановах камісіі па правядзеньні Кастрычніцкіх сьвят, займаемыя імі памяшканьні не пазьней 5 лістапада да 17 гадз.:

а) сьцягамі,
б) пёзунгамі,
в) ілюмінаваць іх.

2. Абавязаць усіх кіраўнікоў дзяржаўных, каапэрацыйных і гандлёвых магазынаў 5-га лістапада да 17-ці гадзін упрыгожыць магазыны вітрынамі.

3. Гандаль праводзіць згодна пастановы гар. інспэкцыі гандлю Менгарсавету за 27 кастрычніка 1932 г.

4. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскласьці на гарадзкую інспэкцыю гандлю і міліцыю.

5. Вінаватыя ў парушаньні гэтай абавязковай пастановы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасьці штрафу да 100 р. або прымусовым працам да 2-х тыдняў.

Старшыня Гарсавету ВАЛОДЗЬКА.
Сакратар Гарсавету ЛЮЦЬКО.

СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ ДВБ МЕНСКІ ФІЛІЯЛ ДА XV ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ „КНІГА-ПОШТАЙ“

КАМПЛЕКТУЕ бібліятэкі на розных мовах, прыстасоўваючыся да характэрных умоў мясцовасьці, вытворчасьці і культэапетрабаваньняў—па жаданьні заказчыка.

ПРЫМАЕ заказы на:

1) бібліятэкі парт.-мас. літаратуры да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі—ад 5 да 15 р.

2) бібліятэкі парт. мас. і мастацк. літаратуры да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі—ад 10 да 30 р.

3) Кастрычніцкую бібліятэку для дзяцей—ад 5 да 10 р.

4) альбом „Беларусь Савецкая“, які ў мастацкіх фота адлюстроўвае сац. будаўніцтва БССР з пояснянньнем тэкстам на беларускай і нямецкай мовах.

Альбом надрукаваны на высокакачаснай паперы спосабам мэцо-цінто ў каленкіраваай аправе з цісьненьнем—25 р.

ВЫСЫЛАЕ плякаты, пёзунгі, партрэты.

Зьвернута асаблівая ўвага на аператыўнасьць і хутчэйшае выкананьне заказаў.

Кнігі высылаюцца паштовымі пакункамі накладной платай, пры атрыманьні задатку 25 проц. з сумы заказу.

Пры атрыманьні ўсёй сумы заказу ўперад—парасылка даромна.

Заказы накіроўвайце па адрасе: Менск, Ленінская, 15, Цэнтральная Кнігарня ДВБ, „Кніга-поштай“.

МЕНСКІ ФІЛІЯЛ.

Менгарком КП(б)Б і гарком саюзу работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю склікаюць АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ вылучэнцаў і мабілізаваных у сыстэме каапэрацыі і дзяржгандлю.

ПАРАДАК ДНЯ:

аб задачах і вылучэньні ролі вылучэнцаў і мабілізаваных у сыстэме каапэрацыі і дзяржгандлю (даклад т. Ясьніна).

Зьлёт адбудзецца ў памяшканьні клюбу друкароў (Ленінская, 13, на двары) 29 кастрычніка, у 7 гадз. вечара.

Пасьля зьлёту адбудзецца мастацкая частка.

Менгарком КП(б)Б.
Менгарком саюзу Рпід.

БЕЛАРУСКІ ТЭХНІКУМ па барацьбе са шкодникамі і хваробамі ў сельскай гаспадарцы і па вывучэньні хэмічнай справы паведамляе, што набор у тэхнікум працягнут да 15 XI г. г.

Без іспытаў прымаюцца асобы, скончыўшыя самігодкі, ШКМ і іншыя раўналежныя ім школы.

Прынятыя забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыямі пасьля першага трымэстру ў залежнасьці ад якасьці вучобы ад 35 да 55 руб.

Заявы накіроўваць па адрасе: гор. Віцебск, пляц Волі, дом № 2—Тэхнікум АБІІ. Там-жа прымаюцца заявы і на вячэрнае аддзяленьне.

АБІІ.

Выдавецтву „Зьвязда“ патрэбна цішучая МАШЫНІКА. З прапановамі зварачацца ў кантору выдавецтва „Зьвязда“ Савецкая, 61, 2-гі паверх.

НЯДОРАГА ПРАДАЕЦЦА РАЯЛЬ Пляц 25 Кастрычніка (б. Юбілейная) д. № 5, кв. 1.

Менск, друкарня «Зьвязды» Галоўлітбел 337.